КУЛЬТУРА › ГРАМАДСТВА › ЭКАНОМІКА ›
ЛЮДЗІ › ПАДЗЕІ › ФАКТЫ

‹ № 14 (237) ‹ 8 красавіка ‹ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час

ISSN 2218-2144



**ЖАРСЦІ ПА ПАГОНАХ**
Стар. 6

**«ЛІХІЯ 90-Я» ВЯРТАЮЦЦА?**
Ажыятаж на валютным рынку… Шмат курсаў валют… Чэргі на набыццё долараў…
Стар. 3

**АПОШНІ РАЗ НАЗАРБАЕВА?**
Нурсултан Назарбаеў чарговы раз стаў прэзідэнтам. Ці адрозніваліся гэтыя выбары ад папярэдніх? Пра гэта журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з казахскім журналістам Айнурам Курбатавым
Стар. 12

**МІХАЛЕВІЧ ПАДМАНВАЕ ГЭБОЎЦАЎ**
Стар. 15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**УЛАД ВЯЛІЧКА**
Нарыс Аляксандра Тамковіча з цыклу «Трэці сектар у асобах»

ЭКАНОМІКА

# ПАДВЕШАНАЯ СТАБІЛЬНАСЦЬ

Вольга ХВОІН

**Упэўненасць у стабільным заўтра імкліва знікае. Дастаткова зайсці ў краму і паглядзець, як людзі скрынкамі скупляюць алей, цукар, крупы, а пад пунктамі абмену валют стаяць доўгія чэргі, каб канвертаваць рубель у еўра ці долары, у чаканні, што нехта здасць дзясятку-другую замежных банкнот. Нарастанне адчування асуджанасці на крах падмацоўваецца і тым, што кіраўніцтва Беларусі адмаўляецца гаварыць аб складанасці эканамічнай сітуацыі. Ніхто з прадстаўнікоў ураду не агучвае канкрэтнага плану мераў, што мусяць прадухіліць абвал беларускай эканомікі.**




Сацыёлагі Незалежнага інстытута сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў прыводзяць вынікі нацыянальнага апытання, праведзенага ў снежні мінулага года. Звернем увагу, што акурат напрыканцы 2010-га былі падвышаныя заробкі бюджэтнікам, стрымліваўся рост коштаў.

«Параўнанне «эканамічнага самаадчування» беларусаў пасля прэзідэнцкіх выбараў 19 снежня 2010 года з тым, якім яно было пасля выбараў 19 сакавіка 2006 года, паказвае пагаршэнне. Так, колькасць рэспандэнтаў, якія адзначылі, што іх матэрыяльнае становішча за апошнія тры месяцы пагоршылася, узрасла з 12% да 16%, нягледзячы на тое, што сярэдні памер даходаў (у тым ліку зарплаты, пенсіі, дапамогі і іншыя падпрацоўкі), які прыходзіўся на аднаго члена сям'і ў мінулым месяцы, узрос са 119 да 200 долараў, — гавораць аўтары апытання. — Узрастае трывога за будучыню: калі пяць гадоў таму 44,3% меркавалі, што сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў Беларусі ў бліжэйшыя гады палепшыцца, то сёння — толькі 30,6%. Таму, як і раней, беларусы больш спадзяюцца на «цвёрдую валюту», чым на свае рублі: найбольшым даверам у іх карыстаюцца долары ЗША (47,4%) і еўра (17,7%). Колькасць тых, хто лічыць, што «ў цэлым сітуацыя ў Беларусі развіваецца ў правільным кірунку», за гэты час знізілася з 59,5% да 54,2%, а ў «няправільным», наадварот, узрасла з 30,7% да 32,5%».

Вынікаў падобнага апытання на бягучы перыяд пакуль няма, аднак агульныя настроі істотна зрушыліся ў адмоўны бок. Але імклівы рост цэн на прадукты харчавання, спажывецкія тавары, камунальныя паслугі, праезд у транспарце ад кашалькоў беларусаў не схаваеш. Негатыўныя чаканні раней былі больш характэрныя для сталіцы — уплывала адкрытая інфармацыйная прастора. Цяпер і жыхары рэгіёнаў заклапочаныя пытаннямі «чаго чакаць далей?», бо ў дадатак да беспрацоўя, якое мае месца ў рэальнасці, а не на паперы, больш нізкіх заробках, чым у сталіцы, ёсць нявызначанасць. Кіраўніцтва Беларусі адмаўляецца гаварыць аб складанасці эканамічнай сітуацыі. Ніхто з прадстаўнікоў ураду не агучвае канкрэтнага плану мераў, што мусяць прадухіліць абвал беларускай эканомікі.

Кіраўніцтва Нацыянальнага банка ўводзіць адну за другой пастановы, якія сведчаць калі не аб паніцы ў галовах яго кіраўніцтва, то аб сутаргавых спробах справіцца з нарастаючым комам праблем. Напрыклад, ужо ў студзені быў выдадзены ўказ, якім забараняецца юрыдычным асобам браць крэдыты ў валюце для авансавання імпарту. Потым з'яўляецца пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнага банка ад 2011.02.25 № 240/5 «Аб разліках па імпарце некаторых тавараў» пра абмежаванне разлікаў на партыі тавараў, коштам больш за 50 тысяч еўра. Усім стала зразумела, што з валютнымі запасамі кепска, да таго ж ствараюцца праблемныя сітуацыі для бізнэсу. Потым Нацбанк павялічвае да 30 дзён тэрмін рэзервавання сродкаў у беларускіх рублях на пакупку замежнай валюты на біржы, потым адмяняе гэтае рашэнне з пазнакай «прыярытэтнасці накірункаў». І хаця гэта хутка адмянілі, сітуацыю гэты ўжо не змяніла.

Аляксандр Лукашэнка ў час рабочай паездкі ў Брэсцкую вобласць заявіў, што праблемы з валютай — гэта вынік хуткага падвышэння мытных пошлін, чэргаў ля абменнікаў, уведзеныя абмежаванні на пакупку валюты бізнэсоўцамі.

Эксперты настойваюць на радыкальных мерах, інакш трэба чакаць сістэмнага крызісу. «Уведзены Нацбанкам мараторый на якія-небудзь дзеянні — гэта спроба схавацца ад рашэння праблем. Можна вітаць заявы Нацбанка аб тым, што яны будуць ствараць пазабіржавы рынак, але трэба ствараць і ўмовы, пры якіх ён будзе працаваць. А такая ўмова адна — дэвальвацыя рубля. Рубель трэба адпусціць у свабоднае плаванне», — прыводзіць «Інтэрфакс—Захад» словы старшыні бізнэс-саюза прадпрымальнікаў і наймальнікаў ім. Куняўскага Георгія Бадзея.

Кіраўніцтва краіны ідзе па наезджанай дарозе — пошук крэдытаў на падтрыманне беларускага рубля. Беларусь падала ў Міністэрства фінансаў Расіі праект праграмы антыкрызісных мер для атрымання стабілізацыйнага крэдыту ў 1 мільярд долараў. Міністр эканомікі Мікалай Снапкоў паведаміў журналістам, што ў праграме закладзены меры па ўзмацненні жорсткасці падатковай і грашова-крэдытнай палітыкі. Але канкрэтыкі пакуль няма, як і гарантыі, што гэтыя меры будуць рэалізаваныя.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# ВЫКРУЧВАННЕ РУК

Альбіна ВІШНЕЎСКАЯ

**У Беларусі разгарнулася татальная кампанія прымусовай дактыласкапіі. Гэтай працэдуры «падлягаюць» усе ваеннаабавязаныя грамадзяне краіны.**

Асноўную працу па дактыласкапіі і фотаўліку, як адзначыў праваабаронца Валянцін Стэфановіч, вядзе МУС. «Першапачаткова выклікалі ў ваенкаматы, — Але там адбіткі пальцаў зноў жа міліцыя здымала. Зараз і ў ваенкаматы не выклікаюць. Увогуле па дамах ходзяць і там на месцы здымаюць. Але тое, што яны зараз актывізаваліся, гэта праўда».

З непаслухмянымі грамадзянамі спрабуюць змагацца пакараннямі. У брэсцкага праваабаронцы Рамана Кісляка зняць адбіткі пальцаў сілай міліцыянтам не ўдалося. Пры гэтым праваабаронцу нанеслі траўму кісці правай рукі, што ён і зафіксаваў у траўмапункце бальніцы. У пастарунку на яго склалі пратакол аб непадпарадкаванні супрацоўнікам міліцыі. Раман Кісляк накіраваў скаргу ў пракуратуру наконт іх супрацьпраўных сілавых дзеянняў.

Работніка чыгункі з вёскі Мельнікі Маларыцкага раёна Рыгора Лук'янчука міліцыянты папросту праследавалі. Як паведамілі праваабаронцы «Вясны», яго выклікалі па тэлефоне, прыязджалі дадому і нарэшце спынілі на станцыі Мельнікі. Мужчыне ўручылі паперы аб адміністратыўнай адказнасці і, адпаведна, штрафе 30 базавых велічынь за непадпарадкаванне супрацоўнікам міліцыі.

Не пагадзіўся прымусова здаваць адбіткі пальцаў Аляксандр Капылоў, які працуе з Лук'янчуком. Як кажа Аляксандр, ён законапаслухмяны грамадзянін. А прымусовую здачу адбіткаў пальцаў расцэньвае як прыніжэнне яго асобы.

Як зазначыў Валянцін Стэфановіч, людзям не падабаецца, што ўлады ўмешваюцца ў іх прыватнае жыццё. «Якімі б мэтамі не прыкрываліся, але чалавеку не падабаецца, што ў яго адбіткі пальцаў бяруць, фатаграфуюць яго, яшчэ штосьці з ім робяць. Гэта натуральна», — падкрэсліў праваабаронца. Да таго ж, адзначыў ён, «улічваючы, у якой мы краіне знаходзімся і актыўнасць нашых спецслужбаў, якая скіраваная ў мэтах палітычнага пераследу некаторых грамадзян».

Праваабаронцу Алегу Волчаку прызначылі праходжанне дактыласкапіі на 25 сакавіка — у Дзень Волі. Прыслалі позву з міліцыі і ў выпадку адмовы папярэдзілі аб адміністратыўнай адказнасці. Алег Волчак накіраваў заяву ў ваенкамат Фрунзенскага раёна Мінска. І папрасіў згодна з законам «Аб зваротах грамадзян» адказаць на 14 пытанняў, якія ўзніклі ў яго наконт гэтай працэдуры. У прыватнасці, у чым неабходнасць «такога экстраннага збору» адбіткаў пальцаў рук у ваеннаабавязаных. І на падставе якой «канкрэтнай нормы закона» караюць грамадзян, якія адмаўляюцца ад дактыласкапіі.

А палітолаг Алесь Лагвінец у сваёй заяве ў міліцыю ў сувязі з «дамаганнямі» паведаміў аб гатоўнасці «здаць пальчыкі». Але пасля таго, як гэта публічна зробіць «асоба, якая займае пасаду прэзідэнта Рэспублікі Беларусь». І шэраг іншых асобаў, сярод якіх генпракурор, кіраўнікі КДБ, Савета Бяспекі, Канстытуцыйнага і Вярхоўнага судоў, а таксама міністры і дэпутаты.

СПРАВЫ

# ВЫБАР НЕБАГАТЫ

Таццяна ШЭЛЕГ

**Змякчэнне абвінавачання для шэрагу фігурантаў «справы 19 снежня» сталася вынікам санкцый Захаду. Беларускія ўлады, як адзначыў праваабаронца Валянцін Стэфановіч, вырашылі «зняць вастрыню пытання».**

На працягу тыдня 10 абвінавачаным змянілі крымінальны артыкул. Замест «масавых беспарадкаў» (арт. 293) ім зараз інкрымінуюць грубае парушэнне грамадскага парадку (арт. 342). Максімальнае пакаранне па ранейшым артыкуле прадугледжвае да 15 гадоў пазбаўлення волі, па цяперашнім — да трох гадоў.

Змякчэнне абвінавачання, як зазначыў Валянцін Стэфановіч, робіцца не таму, што следства пачало дасканала разбірацца ў акалічнасцях справы. І раптам прыйшло да высновы, што пэўныя людзі не здзяйснялі «масавыя беспарадкі».

«Гэта ёсць рэакцыя ўладаў на канкрэтныя крокі і ЗША, і Еўрасаюза ў накірунку эканамічных санкцый. Злучаныя Штаты ўвялі санкцыі ў дачыненні да «Беларуснафты» і шэрагу іншых беларускіх прадпрыемстваў, і заклікалі пры гэтым Еўрасаюз кіравацца іх прыкладам», — кажа Валянцін Стэфановіч.

А шэраг палітыкаў у Еўрасаюзе, кшталту еўракамісара Штэфана Фюле, пачалі казаць аб магчымых кропкавых эканамічных санкцыях у дачыненні да Беларусі. І афіцыйны Мінск пайшоў на перакваліфікацыю абвінавачання. «Гэта спроба не вырашыць праблему цалкам, але хаця б зняць вастрыню пытання», — падкрэсліў Валянцін Стэфановіч.

Крокі ўладаў не здымаюць з парадку дня пытанне вызвалення палітвязняў. Акрамя 10 чалавек, якім перакваліфікавалі абвінавачанне, больш за 30 па-ранейшаму абвінавачваюцца ў «масавых беспарадках».

У афіцыйным паведамленні МУС пра перакваліфікацыю абвінавачання ўлады самі сябе абвяргаюць, што «справа 19 снежня» не палітычная. У ім гаворыцца, што «безгрунтоўныя сцвярджанні» пра прызнанне выбараў прэзідэнта несапраўднымі сталі «штучна створанай падставай» для ўвядзення санкцый з боку Захаду.

«Наша пазіцыя — масавых беспарадкаў 19 снежня не было. І мы настойваем на вызваленні ўсіх палітычных зняволеных, — зазначыў Валянцін Стэфановіч. — Гэта магчыма, калі на тое будзе палітычная воля краін Еўрасаюза. Ёсць механізмы — эканамічныя санкцыі. І тады будуць вызваленыя палітвязні. Усё вельмі проста».

«Я не выключаю, што людзі могуць быць асуджаныя на розныя тэрміны пазбаўлення волі. І на чатыры, і больш гадоў. Але я мяркую, што ніхто з іх гэтыя тэрміны да канца адседжваць не будзе. Думаю, што пры цяперашняй эканамічнай сітуацыі ва ўлады небагаты выбар», — заявіў Валянцін Стэфановіч.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# КДБ УЗЯЎСЯ ЗА ПЕРАДАЧЫ

Таццяна ШЭЛЕГ

**Толькі два разы на месяц можна будзе прыносіць перадачы ў СІЗА КДБ. Раней іх маглі перадаваць тры разы на тыдзень.**

Агульная вага перадачы, паводле новаўвядзення КДБ, не змянілася. Яна па-ранейшаму складае 30 кілаграмаў на месяц. Аднак радыкальнае скарачэнне колькасці перадач стварыла праблему і для вязняў, і для іх сваякоў. «Родным даводзіцца валачы аж па 15 кілаграмаў за раз. То бок гэта даволі складана», — адзначыла праваабаронца Наста Лойка. Паўстае і праблема захавання прадуктаў у СІЗА на працягу паловы месяца.

Да таго ж, як падкрэсліла Наста Лойка, перадачы для зняволеных — вельмі вялікі псіхалагічны фактар. Бо карэспандэнцыя ў «амерыканку» даходзіць праблемна. Таму перадачы — гэта яшчэ і «вестачкі з волі». Яны нагадваюць зняволеным, што пра іх помняць. «Людзям прыемна, калі часцей прыносяць перадачкі», — адзначыла праваабаронца. І два разы на месяц такіх пасланняў з волі, на яе думку, малавата для тых, хто знаходзіцца ў вязніцы.

«Да гэтага змены былі ўнесены ў спіс прадуктаў, якія можна перадаваць. Яго таксама значна скарацілі», — нагадала Наста Лойка. КДБ пасля змяшчэння ў «амерыканку» палітвязняў забараніў перадаваць шэраг прадуктаў.

Але застаецца яшчэ магчымасць дасылаць у СІЗА КДБ пасылкі. У адрозненні ад міліцэйскага СІЗА №1 (Валадаркі), яны не залічваюцца ў лімітаваную вагу перадач. Любы чалавек, як адзначыла Наста Лойка, можа дасылаць палітзняволенаму пасылку. «І ён будзе адчуваць падтрымку. Калі лісты яму не даходзяць, то пасылка — гэта таксама прывітанне з волі», — зазначыла яна.

РЭГІЁН

# БУДЗЕМ З МІНЕРАЛКАЙ

Іван БАРЫСАЎ

**Новы цэх па вытворчасці мінеральнай вады павінен пачаць працаваць у ААТ «Новая Друць» Бялыніцкага раёна ўжо ў маі гэтага года. Плануецца таксама, што, акрамя лініі па разліву мінеральнай вады, у цэху будуць працаваць яшчэ дзве аўтаматычныя лініі — па разліву пітной і салодкай вады. Прадукцыйнасць кожнай лініі складзе каля 2 тысяч літраў вады за гадзіну.**



Будаўніцтва цэха па разліву мінеральнай вады ў ААТ «Новая Друць» ажыццяўляецца бялыніцкім ПМК №241, які з'яўляецца найбуйнейшым сярод чатырох будаўнічых і рамонтна-будаўнічых прадпрыемстваў Бялыніцкага раёна.

Згодна першапачатковым планам, цэх па вытворчасці пітной і мінеральнай вады, якая будзе дабывацца з тампанаваных свідравін, размешчаных на тэрыторыі «Новай Друці», павінен быў увайсці ў эксплуатацыю яшчэ ў першай палове мінулага 2010 года, але, як гэта ў нас часта бывае, штосьці не склалася, і тэрмін заканчэння будаўніцтва быў перанесены. Даходаў ад продажу «мінералкі» мінулым спякотным летам ААТ «Новая Друць» так і не атрымала...

Нагадаю, што ААТ «Новая Друць» з'яўляецца буйнейшым сельскагаспадарчым прадпрыемствам Бялыніцкага раёна. Таварыства ўваходзіць у лік дванаццаці прадпрыемстваў, што складаюць ААТ «Агракамбінат «Мачулішчы», які належыць Нацыянальнаму банку Рэспублікі Беларусь. У Магілёўскай вобласці, акрамя «Новай Друці», Нацыянальнаму банку належыць яшчэ і ААТ «Александрыйскае», якое знаходзіцца на «малой радзіме» Аляксандра Лукашэнкі ў Шклоўскім раёне.

Старшыня праўлення Нацбанку Пётр Пракаповіч у студзені гэтага года заявіў, што Нацбанк ужо прыступіў да продажу сваіх гаспадарак, і зараз ідзе падрыхтоўка да продажу двух прадпрыемстваў.

Пакуль жа плануецца, што ў гэтым годзе ў ААТ «Новая Друць» сіламі бялыніцкага ПМК №241 будуць пабудаваныя, акрамя цэха па разліву мінеральнай і пітной вады, яшчэ і сучаснае бульбасховішча, дванаццаці-кватэрны жылы дом сядзібнага тыпу ў аграгарадках Цяхцін і Вялікая Машчаніца, а таксама прадоўжана рэканструкцыя другой чаргі малочна-таварнага комплексу ў вёсцы Стараселле.

Супрацоўнікі ААТ «Новая Друць» жартуюць (а, як добра вядома, у кожным жарце ёсць доля жарту): «Дзякуй Богу, што ёсць Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь і яго грошы».

СПІСЫ

# РАСІЯНЕ НОН-ГРАТА

Вольга ХВОІН

**У Расіі пачалася грамадзянская кампанія «За адкрыты ўезд у Беларусь». Ідэя кампаніі ўзнікла ў сувязі з тым, што грамадзяне Расіі, Украіны пачалі сутыкацца ў фактамі дэпартацыі з Беларусі і спісамі неўязных.**

«Падчас кампаніі мы хацелі б атрымаць афіцыйны адказ з боку органаў улады Беларусі, ці існуюць падобныя спісы, як у гэтыя спісы трапляюць расіяне і — самае галоўнае — якім чынам звычайны грамадзянін можа даведацца пра ўнясенне сябе ў гэтыя спісы», — паведамляюць арганізатары кампаніі.

У сакавіку, напрыклад, грамадзянін Расіі, дырэктар па развіцці Маскоўскай Хельсінскай групы Андрэй Юраў быў дэпартаваны з Беларусі. Прадстаўнік МЗС Беларусі абверг інфармацыю аб наяўнасці спісаў неўязных у Беларусь грамадзян Расіі, але разам з тым Юраў атрымаў дакумент, дзе прадстаўнікі праваахоўных органаў, спасылаліся на спісы неўязных.

У межах кампаніі грамадзянам Расіі і розным арганізацыям прапануецца адпраўляць звароты ў Міністэрства замежных спраў Расіі і ў Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расіі. Так, Маскоўская Хельсінская група першая падрыхтавала адпаведныя лісты для высвятлення сітуацыі са спісамі.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# «ЛІХІЯ 90-Я» ВЯРТАЮЦЦА?




Сяргей САЛАЎЁЎ

**Ажыятаж на валютным рынку… Шмат курсаў валют… Чэргі на набыццё募 долараў… Тое, што прадказваў раней эканаміст Сяргей Чалы, ужо з'явілася — бабулькі каля абменных пунктаў скупляюць валюту па вышэйшым курсе. Ужо і мае знаёмыя сутыкнуліся з «шэрымі курсамі» валют.**

Хто ж вінаваты ў такой сітуацыі? Арыгінальную версію, як заўсёды, прапанаваў беларускі правадыр Аляксандр Лукашэнка. Па ягоным меркаванні, ажыятаж на валютным рынку пройдзе пасля павышэння мытных пошлін на аўтамабілі. Пра гэта заявіў Аляксандр Лукашэнка 5 красавіка падчас рабочай паездкі ў Брэсцкую вобласць, фрагменты якой былі паказаныя па Першым канале Беларускага тэлебачання.

«Вядома, нас вельмі моцна падкасіў ажыятаж з аўтамабілямі. Мы паглядзелі — там больш як мільярд. Былі нават прапановы ўвесці зараз гэтую пошліну. Але гэта ўдар па людзях, навошта ж ужо сваіх людзей давіць? Вытрымаем мы гэта, няхай людзі купяць сабе машыну якую хочуць, заменяць, калі трэба», — сказаў Лукашэнка.

Паводле яго слоў, урад працуе над вырашэннем валютнага пытання. «Але шчыра: валюта ёсць — ідзі купляй, прадавай, няма валюты — з засекаў мы больш браць не будзем, золатавалютны рэзерв — гэта святое. Мы павінны яго папаўняць», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Праз некалькі месяцаў сітуацыя супакоіцца, і людзі, наадварот, будуць мяняць валюту на беларускія рублі, мяркуе Лукашэнка.

Во, аказваецца, як! Беларусы масава скупляюць валюту для таго, каб набыць замежныя аўто! Таму валюты і не хапае! А не з-за таго, што адмоўнае сальда знешняга гандлю таварамі, паводле даных гандлёвага балансу, за студзень — люты 2011 года склала 1 мільярд 967,3 мільёна долараў. Варта нагадаць, што за такі ж леташні перыяд гэты паказчык складаў 468 мільёнаў долараў.

У сакавіку аб'ём золатавалютных рэзерваў Беларусі па стандартах МВФ знізіўся на 262,3 мільёна долараў ЗША і, паводле папярэдніх звестак, на 1 красавіка 2011 года склаў 3 мільярда 761,3 мільёна долараў супраць 5 мільярдаў 30,7 мільёна долараў на пачатак года.

Такім чынам, у параўнанні з пачаткам 2011 года аб'ём ЗВР Беларусі скараціўся на 1 мільярд 270 мільёнаў долараў, або на 25%. Як кажуць у Нацыянальным банку, асноўнай прычынай зніжэння аб'ёму золатавалютных рэзерваў у сакавіку стаў высокі попыт на замежную валюту з боку насельніцтва.

Ёсць яшчэ адна фішка ў гэтым пытанні. Канцэрн «Белнафтахім» афіцыйна паведаміў пра павышэнне з 31 сакавіка ў сярэднім на 10% рознічных цэн на нафтапрадукты. Рознічная цана за 1 літр складае: бензін Нармаль–80 — 3 150 рублёў (была 2 850; рост на 10,5%), бензін Аі–92 — 3 300 рублёў (3 000; +10%), бензін Аі–95 — 3 750 (3 400; +10,3%), бензін Аі–95–Еўра — 3 750 (3 400; +10,3%), дызельнае паліва — 3 150 рублёў (2 850; +10,5%). Цэны павялічаныя «для павышэння эфектыўнасці працы нафтаперапрацоўчых прадпрыемстваў і ў мэтах абароны ўнутранага рынку».

Вось так. Атрымліваецца, што грамадзяне скупаюць валюту, каб набыць «нерэнтабельныя» аўтамабілі, кошт на паліва для якіх усё даражэе і даражэе. Чаму так адбываецца? Хіба беларусы такія дурныя, каб набываць аўтамабілі сабе ў шкоду? Няма веры такім версіям.

Падаражэў таксама і праезд у грамадскім транспарце — да 850 рублёў.

Але што нам, кабанам? У нас значна большыя праблемы. Аляксандр Лукашэнка апасаецца «адраджэння дактрыны аднапалярнага свету». Пра гэта кіраўнік дзяржавы заявіў 4 красавіка падчас уручэння яму даверчых грамат пасламі шэрагу краін.

«Зараз паміж дзяржавамі ўзрастае канкурэнцыя за доступ да рэсурсаў, перспектыўных рынкаў збыту. На вялікі жаль, гэтае саперніцтва набывае часам надзвычай жорсткі характар, аж да адраджэння дактрыны аднапалярнага свету і вяртання да права моцнага дыктаваць усім сваю волю і ўмешвацца ва ўнутраныя справы суверэнных дзяржаў», — сказаў Лукашэнка ў рэпартажы на БТ.

«Для многіх дзяржаў, як і для нас, гэта не пусты гук, а праяўленне санкцый, шантажу, ціску з боку звышдзяржаў, — сказаў беларускі кіраўнік. — Таму Беларусь паслядоўна выступае за прынцыпы справядлівасці і раўнапраўнай уцягнутасці ўсіх дзяржаў, незалежна ад іх маштабаў, у прыняцце ключавых рашэнняў міжнароднага парадку дня і ўліку іх інтарэсаў».

Канешне, аднапалярны свет для нас значна больш важны, чым дабрабыт сваіх грамадзян! «Доступ да рэсурсаў», якіх у Беларусі няма, — ні газа, ні нафты, адзінае — лес. У выніку — дровы. Хто будзе змагацца за дровы? Можа, не трэба лезці ў міжнародныя разборкі са сваімі пяццю капейкамі, калі мы з гэтага нічога не маем? «Прынцыпы справядлівасці» тады моцныя, калі сам можаш быць моцным. А ў нас моцы няма. Самі разлічваем на крэдыты: Расіі, ЗША, Еўрасаюза. Дзяржава моцная, калі моцныя яе грамадзяне. Калі яны не стаяць у чэргах па замежную валюту.

І яшчэ. У мінулых матэрыялах я пісаў з запытам: «Хто яшчэ нападзе пад дыскрэдытацыю Беларусі?» Тыдня не прайшло — напалі.

6 красавіка «Комсомольская правда» апублікавала матэрыял пра тое, што арміі Муамара Кадафі нібыта дапамагаюць грамадзяне Беларусі. Пры гэтым падкрэслівалася, што ні расійскіх, ні ўкраінскіх ваенных у Лівіі няма.

Паводле звестак выдання, кантынгент беларускіх ваенных дарадцаў у Лівіі дасягаў да пачатку ваенных дзеянняў 500 чалавек. «Частка з іх, у асноўным высокапастаўленыя ваенныя, былі эвакуяваныя з Лівіі на самалётах у Мінск», — напісала «КП» са спасылкай на дарадцу пасольства Беларусі ў Трыпалі Георгія Грамыку.

Выданне таксама цытуе крыніцу ў штабе Міністэрства абароны Беларусі, паводле слоў якога «практыка адпраўлення ваенных спяцоў у Лівію існуе даўно». «Частка з іх займаюцца эксплуатацыяй ваеннай тэхнікі, многія выконваюць абавязкі дарадцаў камандзіраў лівійскіх воінскіх часцей. Прысутнічаюць у краіне і супрацоўнікі беларускага ГРУ. Большай часткай гэта афіцэры былога 334-га атрада спецназа, дыслакаванага ў Мар'інай Горцы пад Мінскам. Але ўсе яны заключалі індывідуальныя кантракты з лівійскімі ўладамі і атрымлівалі фінансаванне менавіта ад іх», — гаворыцца ў артыкуле.

Мінабароны патрапіць пад раздачу? Хаця і называе інфармацыю ў «КП» фальсіфікацыяй і правакацыяй.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### БУДЗІМІР



Былы пазаштатны супрацоўнік «Радыё Свабода» Дзмітрый Галко, вядомы пад імем Будзімір, распачаў бестэрміновую галадоўку пратэсту, патрабуючы вызвалення палітвязняў. «Не магу па-ранейшаму пасіўна назіраць за палітычным бязмежжам, што існуе ў маёй краіне, абмяжоўваючыся шчоўканнем дзюбай у жэжэ, — напісаў ён у сваім блогу. — Пачаць жа, напрыклад, індывідуальны тэрор перашкаджаюць засвоеныя ідэалы гуманізму. Як сказаў таварыш Гендальф: «Шмат хто з тых, хто жыве, заслугоўвае смерці, так як і многія з памерлых — жыцця... Таму я вырашыў вывесці з эканамічнага кругавароту ўласны арганізм, абвясціўшы бестэрміновую галадоўку. Паставіць на кон сваё здароўе і жыццё, няхай падавяцца. У знак пратэсту супраць палітычных рэпрэсіяў з боку ўладаў і бязвольных запісных апазіцыянераў, якія засталіся на волі.

Будзімір патлумачыў, што яго натхніла ірландская галадоўка 1981 года. Дзмітрый Галко прызнае, што галадоўка як акцыя пратэсту ў Беларусі дыскрэдытаваная. Аднак прыводзіць і пазітыўныя прыклады — галадоўкі вернікаў царквы «Новае жыццё» ў 2006 годзе і кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Казуліна, калі ён быў у зняволенні.

### МІКАЛАЙ КВАНТАЛІАНІ



Кіраўнік «Цэнтра развіцця валанцёрства» Мікалай Кванталіані заявіў, што прадстаўнік КДБ спрабаваў схіляць яго да супрацоўніцтва і абяцаў праблемы з рэгістрацыяй у выпадку адмовы. У выніку праз два тыдні Міністэрства юстыцыі адмовіла ў рэгістрацыі грамадскага аб'яднання «Цэнтр развіцця валанцёрства», спаслаўшыся на юрыдычныя парушэнні. Заснавальнікі цэнтра падаюць апеляцыю ў суд і скаргу ў пракуратуру, каб праверыць дзеянні чалавека, які спрабаваў вербаваць Мікалая.

Мікалай Кванталіані расказаў, што мэтай стварэння арганізацыі было далучаць людзей да валанцёрскай працы для вырашэння сацыяльных праблем. Актывісты «Цэнтра развіцця валанцёрства» планавалі працаваць з інвалідамі, бяздомнымі, займацца вырашэннем праблемы бяздомных жывёл.

Да слова, у Беларусі многа прыватных, персанальных ініцыятыў людзей у гэтых кірунках. Многа людзей ездзіць працаваць задарма ў Хоспісы, анкалагічны цэнтр, прытулак для катоў і сабак.

### ДЗМІТРЫЙ КРАЎЧАНКА



У хакей гуляюць сапраўдныя мужчыны, якія і гол заб'юць, і твар разаб'юць суперніку — такія высновы можна зрабіць па выніках сустрэчы хакейных клубаў «Юнацтва» і «Гродна».

Трэнер хакейнага клуба «Юнацтва» пасля матчу з клубам «Гродна» не выйшаў на цырымонію паціскання рук, а падчас прэс-канферэнцыі абразліва выказваўся на адрас суперніка. «Я наогул там каманды не бачыў. Больш смешнай за яе ў плэй-оф яшчэ не было. Яны да брамы даехалі хоць раз сёння? «Нёман» выйграў столькі матчаў, колькі мы вырашылі. Мне сорамна за іх. Увесь плэй-оф мы гулялі з імі ў «коткі-мышкі». Больш бяззубай і слабай каманды ў плэй-оф я яшчэ не бачыў», — цытуе Міхаіла Захарава газета «Прэсбол». «Юнацтва» заваявала медалі нацыянальнага чэмпіянату шосты раз, выйграўшы ў гродзенцаў серыю з лікам 4:2.

Трэнер «Нёмана» Дзмітрый Краўчанка да журналістаў выйшаў пасля Захарава і прыгразіў яму зламаць нос за абразы. «Я не быў сведкам гэтага, мне цяжка каментаваць. Калі б Міхал Міхалыч апынуўся сам-насам са мной, то ён бы моцна пашкадаваў пра сказанае. Але вы не ўяўляеце, як у яго трэсліся рукі перад гульнёй. Калі Захараву ёсць што сказаць, то хай гэта зробіць адзін на адзін, таму што пры сведках я біцца не буду. Гэта я не проста так кажу — нос бы я яму зламаў дакладна, — заявіў Дзмітрый Краўчанка. — Ён чалавек пагардлівы. Можа, гэта ў чымсьці і добра, але гуляе не ён, а яго падапечныя. І гэтыя словы сказалі не хакеісты, а трэнер. Паказваючы свае слабыя бакі, ён ад гэтага мацней не становіцца. Ён зневажыў хакеістаў у каманду грашыма і сталічнай прапіскай. Заўважце, усе заяўляюць не супраць «Юнацтва», а супраць Захарава. Але я не хачу нічога дрэннага казаць пра яго. Тым больш за вочы. Хачу сказаць дзякуй камандзе «Юнацтва» без трэнера. Гэта годныя хлопцы, яны нездарма выйгралі Кантынентальны кубак».

ГЕАПАЛІТЫКА

# ГАЛОЎНАЯ ЎМОВА НЕ ВЫКОНВАЕЦЦА

Вольга ХВОІН

**На фоне жорсткіх прысудаў удзельнікам мітынгу 19 снежня, пагаршэння эканамічнай сітуацыі, асуджальнай палітыкі Захаду прадстаўнікі ўлады, у тым ліку і Аляксандр Лукашэнка, пачалі рабіць публічныя піяр-заявы пра гатоўнасць да дыялогу з Еўропай, ЗША.**



Гульня ў «добрага-злога» кіраўніка Беларусі прадказальная і прагназуецца станам эканамічнай мэтазгоднасці. Як толькі краіну накрыла хваля фінансавай ліхаманкі, змоўнікі-ворагі сталі сябрамі.

Ужо асуджаныя восем чалавек (трэба сказаць, не са спісу лідараў) па абвінавачванні ў актыўным удзеле ў масавых беспарадках 19 снежня мінулага года, з іх шасцёра атрымалі розныя тэрміны зняволення. Еўрасаюз і ЗША ў адказ прыгразілі адлучыць ад заходніх дабротаў беларускі рэжым і нават увялі «чорныя спісы» неўязных грэшнікаў. На раз — перакваліфікацыя крымінальнага абвінавачання дзесяці фігурантам справы «аб масавых беспарадках» на больш мяккі артыкул.

Следчым упраўленнем папярэдняга расследавання ГУУС Мінгарвыканкама завершана папярэдняе расследаванне крымінальнай справы, заведзенай у дачыненні да грамадзян Беларусі — арганізатараў і ўдзельнікаў масавых беспарадкаў 19 снежня 2010 года. «Паводле высновы следства, атрыманы вычарпальныя доказы аб спробе змены Канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь па папярэдняй змове з прадстаўнікамі замежных дзяржаў і арганізацый, якія па сутнасці ставілі канчатковай мэтай ажыццяўленне дзяржаўнага перавароту. У ходзе расследавання крымінальных спраў устаноўленая роля і ступень удзелу кожнага фігуранта ў падзеях, што адбыліся», — адзначылі ў МУС.

Для развіцця драмы абвінавачванне ў арганізацыі масавых беспарадкаў пакінулі чатыром асобам — экс-кандыдатам у прэзідэнты Мікалаю Статкевічу, Дзмітрыю Усу і Андрэю Санніканаву. Аналагічнае абвінавачванне прад'яўлена былому міліцыянту Аляксандра Класкоўскаму, у яго «бонусам» як былому чалавеку гэтай сістэмы абвінавачванні па арт. 369 («абраза прадстаўніка ўлады») і арт. 382 Крымінальнага кодэкса Беларусі («самавольнае прысваенне звання ці ўлады службовай асобы»).

Не паспелі нядаўнія змоўнікі, арганізатары «дзяржаўнага перавароту» палякі асэнсаваць свой новы статус у Беларусі, як Лукашэнка назваў іх «сваімі людзьмі, якія заўжды яго падтрымлівалі». Хаця зусім нядаўна беларускі лідар гаварыў пра захопніцкія амбіцыі Польшчы: «У Польшчы некаторыя спяць і бачаць: мяжа не там, мяжа каля Мінска... Сталін не там мяжу правёў!» Маўляў, Польшча актыўна ўдзельнічае ў планах Захаду па змене ўлады, маючы свае тэрытарыяльныя прэтэнзіі.

Услед за Лукашэнкам прадстаўнікі вышэйшых эшалонаў улады пачалі расказваць байкі пра збалансаванасць заходняга і ўсходняга вектараў знешняй палітыкі. Напрыклад, старшыня верхняй палаты парламенту Анатоль Рубінаў заявіў, што Беларусь зацікаўлена ў развіцці супрацоўніцтва з Украінай, Польшчай і краінамі Балтыі, у актывізацыі адносін з Саветам Еўропы, АБСЕ і Еўрасаюзам. «Еўропа ідзе на повадзе ў беларускай апазіцыі, якая паразітуе на здаровым целе дзяржавы», — знайшоў крайняга Рубінаў у незадаволенасці міжнароднай супольнасці рэпрэсіямі ўладаў супраць апазіцыі. Ён выказаў упэўненасць, што «ў бліжэйшыя гады нашы адносіны з Еўропай нармалізуюцца».

Такі паварот найперш можна патлумачыць пагрозай эканамічнага краху беларускай эканомікі, да ўсяго, калі Еўропа адасобілася ад «апошняга дыктатара», ён апынуўся сам-насам з Расіяй. А яна ў сваю чаргу хоць і абяцае стабілізацыйны крэдыт, але цяпер не часы Ельцына — за абяцанкі-цацанкі нічога не робіцца.

Палітычны аглядальнік Раман Якаўлеўскі звяртае ўвагу на перамовы міністраў замежных спраў Беларусі і Украіны Сяргея Мартынава і Канстанціна Грышчанкі, што адбыліся ў Мінску напрыканцы сакавіка. Прэс-служба МЗС Беларусі паведаміла, што сустрэча прайшла «ў адпаведнасці з раней дасягнутымі дамоўленасцямі». Бакі абмеркавалі «актуальныя пытанні двухбаковых беларуска-ўкраінскіх адносін».

«Прэзідэнт Украіны Віктар Януковіч, спікер Вярхоўнай рады Украіны Уладзімір Літвін выказвалі ідэю дапамагчы наладзіць кантакты з Захадам, аднак улады Беларусі не хочуць бачыць пасярэднікаў, — зазначае Якаўлеўскі. — Грышчанка ў дадзеным візіце выконваў такую ж ролю, як летась міністр замежных спраў Чэхіі Карл Шварцэнберг. Ён, відаць, даў зразумець, што ніхто не можа Лукашэнку забараніць ехаць у Кіеў на канферэнцыю па чарнобыльскай тэматыцы, але яго прысутнасць там непажаданая. Кіеў зараз значна бліжэй да Брусэля, чым да Мінска». Эксперт прызнае, што ўлады Беларусі цяпер спрабуюць наладзіць манеўры на знешнепалітычнай арэне, але намеру выканаць галоўную ўмову дыялогу — выпусціць палітвязняў — не маюць.

«Не зусім зразумела, хто гэты дыялог будзе весці, калі нават кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Уладзімір Макей, які быў галоўным правадніком палітыкі ў заходнім кірунку, цяпер у спісе неўязных у Еўропу», — падкрэслівае Якаўлеўскі.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# РАЗМОВЫ ВАКОЛ

Вольга ХВОІН

**«Стратэгічныя дэбаты», якія насамрэч такімі фактычна не з'яўляюцца, — прыкладна так можна сфармуляваць абмеркаванне далейшых дзеянняў апазіцыі. Уладзімір Мацкевіч — адзін з аўтараў «Стратэгіі–2012», што распрацаваная ў асяроддзі грамадзянскай супольнасці, і адзін з ініцыятараў маніфесту «Байкот — стратэгія перамогі» Віктар Івашкевіч сустрэліся, каб агучыць свае пазіцыі, адказаць на пытанні апанентаў.**

Дыскусія звялася збольшага да пытанняў «што вы будзеце рабіць і хто за вамі пойдзе» і адказаў ці то ў выглядзе добрай тэорыі, ці ў расплывістых варыяцыях на тэму таго, што «аднойчы сітуацыя пагоршыцца да крытычнай кропкі...». Тут варта прыгадаць рэмарку прадстаўніка руху «Гавары праўду» Андрэя Дзмітрыева, што трэба дабівацца таго, каб людзі на вуліцах абмяркоўвалі не толькі свае праблемы, але і тыя прапановы, з якімі апазіцыя да іх ідзе. Пакуль кулуарныя размовы, стратэгіі не выходзяць за невялікае кола апазіцыйных палітыкаў, можна сцвярджаць, што шырокай падтрымкі іх у грамадстве няма. І ўрэшце трэба прызнаць, што асноўныя ідэі той ці іншай альтэрнатыўнай стратэгіі мусяць быць даведзеныя да цёткі Ганны з N-скага гарадка, знайсці шырокае кола прыхільнікаў.

Аўтары ідэі байкоту заклікаюць лідараў апазіцыі ўплываць на праеўрапейскія структуры, каб былі ўведзеныя шырокія эканамічныя санкцыі. Але дзе праца на месцах? Урэшце, у ідэале палітыкі змагаюцца за сэрцы і розумы беларусаў, а не галандцаў ці немцаў. Аднак працаваць з эканамічнымі пытаннямі пакуль ніхто не бярэцца. Па словах Івашкевіча, такая работа пакуль не вядзецца, але ён «заклікае знаходзіць аднадумцаў, каб разам гэта рабіць». «І ў сацыяльныя агеньчыкі хай стараюцца падліць бензіну», — параіў Віктар Івашкевіч сваім паплечнікам і апанентам з апазіцыйнага стану. Эканамічныя праблемы ў топе абмеркаванняў людзей як мінімум месяц, але атрымліваецца, што скарыстаць сітуацыю на сваю карысць апазіцыйныя лідары не лічаць патрэбным.

Уладзімір Мацкевіч прызнаў, што ўзровень уплывовасці апазіцыі пакуль нізкі, але выйсце з гэтага — кансалідаваная распрацоўка жыццяздольных ідэй. «Мы ўсе сёння паасобку малаўплывовыя. Я на працягу мінулага года гаварыў, што не трэба ісці на выбары, але разумеў, што мае словы нічога не змяняюць. Ці можам мы на нешта ўплываць, калі будзем размаўляць пра кошты на цукар? Але ніхто ў апазіцыі не можа нешта зрабіць з коштамі на цукар, і любы абывацель разумее, што размовы з намі на гэтую тэму — толькі лясы тачыць. Таму мусім паразумецца з шараговым грамадзянінам, прапанаваць яму прывабную ідэю, персону. Прымітыўныя бальшавіцкія падыходы сёння не працуюць», — упэўнены спадар Мацкевіч.

У «Стратэгіі–2012» ёсць ідэя стварэння інстытуту амбудсмена — службовай асобы, на якую ўскладаюцца функцыі кантролю за захаваннем законных правоў і інтарэсаў грамадзян у дзейнасці органаў выканаўчай улады і службовых асоб. Уладзімір Мацкевіч згодны, што цяпер гэты інстытут не мае асаблівага сэнсу, але бачыць яго перспектывы. «Не будзе ўлада лічыцца з амбудсмэнам, мне гэта відавочна, нягледзячы на тое, што я выпучаў такую прапанову. У грамадзянскай супольнасці, палітычнай апазіцыі няма ніякіх сродкаў ціску на ўлады, каб дасягнуць мэты, што ўсіх задавальняла б, бо мы расцярушаныя, — падкрэсліў Мацкевіч. — У плане стратэгіі перамовы з уладамі прызначаныя на лета 2012 года. Цяпер улады не пойдуць на перамовы з амбудсменам, як і на перамовы з Шушкевічам, Мацкевічам. Але гэты інстытут патрэбны, каб прыцягнуць да адной кропкі ўсіх людзей, што закладаючы рэпрэсіямі, наяўнасцю палітзняволеных у краіне. Ціск магчымы толькі масавымі выступленнямі, агульным страйкам, што паралізуе дзеянні ўлады, ці байкотам асабліва істотных падзеяў».

Апаненты запэўніваюць, што гатовыя працаваць на адзіную мэту. Аднак пераходзіць пад крыло адной структуры, аднаго лідара пакуль ніхто не збіраецца. Адзінае радуе, што абодва бакі акцэнтуюць увагу на вызваленні палітзняволеных. Няхай у рознай ступені значнасці і паслядоўнасці. Але гэта дае надзею, што людзі, якія знаходзяцца ў турмах за свае перакананні, не застануцца па-за колам інтарэсаў тых, хто шукае пакуль прывідныя шляхі да ўладных фатэляў.




Віктар Івашкевіч



Уладзімір Мацкевіч

РОЗДУМ

# ЦНОТА ВАВІЛОНСКАЯ

Канстанцін СКУРАТОВІЧ

**Вядомы эканаміст Валер Дашкевіч некалі вельмі дасціпна вызначыў стаўленне беларускага грамадства да ўласнай эканомікі: бяда не ў тым, што дзяржава можа наладзіць вытворчасць самалётаў, бяда — што яна можа змусіць лётаць на іх.**

Хвала Пану Богу, што адмыслоўцы з Адміністрацыі на гэты крок не пайшлі. Няма ў небе беларускіх лайнераў. І калі зверху пасыплецца друз, мы ні пры чым.

Таму можна лічыць сумленне прамысловага беларуса амаль што чыстым. Ён робіць толькі тое, чаму яго калісьці вучылі, і робіць гэта не горай, чым дзенебудзь на постсавецкай прасторы. А тралейбусы ды аўтобусы, мусіць, нават лепей за іншых. Карацей, вядомая песня — камбайны, самазвалы, сеялкі-веялкі, самыя магутныя плугі ў Еўропе. Бачыў неяк натуральны помнік такому плужку. Уражанне — калі на добры трактар, зямлю можна да самых нырак узараць. Што калісьці з вялікім поспехам рабілі меліяратары.

Хай прабачаць прадстаўнікі гэтай паважанай спецыяльнасці, але мне, жыхару неадназова меліяраванай вёскі, яны па шкоднасці для навакольнага асяроддзя толькі крыху саступаюць нямецка-фашысцкім захопнікам. Тры разы на маім веку меліяратары нішчылі ўсё навакольная асяроддзе. Пракапалі канавы і зрабілі дрэнаж нават на пагорках. Помнікі Вялікай эпохі — масты з «волноломами» на канавах, дзе вады не бывае нават у самы дажджлівы год. Але стаяць бетонныя клыкі, чакаюць нейкага цунамі. Голая праўда прыходзіць да цябе і глядзіць пранізліва ў вочы. І разумееш, што гэтыя бетонныя, непатрэбныя зямлі зубы зроблены сарамлівымі людзьмі. Ім вельмі хацелася больш зрабіць і атрымаць, таму яны вось такім дурным чынам «асвойвалі» капіталаўкладанні. Гэта сёння могуць замест трох цаглін пакласці дзве, а тады на кожную будоўлю дзяржкантроль з «метрам» прыязджаў. Сачыў, каб народная ўласнасць цалкам клалася ў народную зямлю. Чым болей уклаў, тым болей і атрымаў.

А калі беларусу плацілі вялікія грошы? Неяк раніцай трапіў у Калодзішчы. У кішэні была паперчына намінальнай вартасці ў 50 тысяч рублёў. Але ў кавярні цётка сказала, што з такой велізарнай сумы рэшты ў яе не будзе. Паспрабаваў купіць пачак цыгарэт у шапіку — безвынікова. У канторы Белаграпрамбанка ўвогуле сказалі, што грошай не мяняюць. Каб былі долары, іншая справа...

Размяняў банкноту ў чарзе, якая чакала дурняў, што прынясуць валюту для абмену на беларускія рублі.

Мне гэты факт падаўся вельмі ўразлівым. Вось яна якая, моцная і квітнеючая наша Беларусь, маючы грош на кішэні можна спачуваць сябе доларавым мільярдэрам — бяры любую дзяўчыну і вязі ў Куршавель. Пастаіш, падумаеш і махнеш рукой — вытворчасць ВУП расце з шалёнай хуткасцю, а ты як быў беларусам, так ім і застаўся. Маю на ўвазе прыкрую акалічнасць — самым бедным сярод еўрапейскіх пралетарыяў працаўніком. А з іншага боку, пры такіх заробках ніколі не патрапіш на экзатычныя курорты, дзе розныя цунамі змываюць людзей у акіян. Жыві і радуйся. На нашым сонцы не абгарыш, у сельве Свіслачы кракадзілы не водзяцца. Калі ж каму пашанцуе нарэшце сэксу, то ў нас ужо амаль усе дзеўкі камсамолкі. То бок істоты высокамаральныя, як гэта было і ў часы КПСС. Дарма кажуць, што тады сэксу не было. Грошай не было — гэта праўда.



Беларусаў змусяць купляць «жыгулі» ды іншыя аўто расійскай зборкі па цэнах нашмат вышэйшых, чым зараз каштуюць прыстойныя, хоць ужо і патрыманыя заходнія аўто

Калі напісаць па-руску — «дешевая политика», то гэта прачытаецца даволі абразліва. Усе ж ведаюць, наколькі не простымі праблемамі займаюцца службоўцы ў доме 38 па вуліцы Карла Маркса ў Мінску. А калі па-беларуску — «танная палітыка», то ўсе зразумеюць, што гэтыя дзеячы за малыя грошы спрабуюць вырашыць складаныя праблемы на карысць простых людзей. Тых самых беларусаў, якія зарабляюць меней за усіх белых (па колеру скуры) людзей на свеце, але бясконца любяць сваіх танных палітыкаў. Зразумела, больш за ўсё галоўнага з іх.

І калі па шчырасці, то ёсць за што. Бо насамрэч у гэтай галаве мазгоў на тузін іншых галоў хопіць. Вось падумайце, колькі дзён таму гэты дзеяч падпісаў канчатковую дамову аб далучэнні Беларусі да Мытнага саюза з Расіяй і Казахстанам. І таму сярод іншых выгод беларусы атрымаюць з 1 ліпеня абавязак плаціць такую ж мыту за імпартаваныя аўтамабілі, якую плацяць насельнікі Расіі. Гэта робіцца дзеля таго, каб падтрымаць дзейнасць расійскай аўтамабільнай вытворчасці, прадукцыя якой не здольная па цане і якасці канкураваць нават з патрыманымі іншамаркамі. Такім чынам, беларусаў змусяць купляць «жыгулі» ды іншыя аўто расійскай зборкі па цэнах нашмат вышэйшых, чым зараз каштуюць прыстойныя, хоць ужо і патрыманыя заходнія аўто.

Еш сваё, пі сваё, купляй сваё... Цэлая філасофія ўжо і з расійскім дадаткам. А народ жа вельмі адчувальны да такой павагі да сябе. Добра памятае, як у яго дзяржава адбірала тыя невялікія грошы, якія ён быццам бы і не зарабіў. Таму ў каго было што, а ў каго і не было, павымяталі схованкі, набралі пазыкаў і кінуліся купляць іншамаркі. Возьмеш у рукі — маеш рэч. Таксама філасофія, якая толькі і дазваляла людзям ратавацца ад празмернай увагі ўлады да сваіх пільных патрэб. Толькі за студзень бягучага года, у параўнанні з першым месяцам 2010-га, колькасць імпартаваных легкавікоў падвысілася ў 2,2 разы і дасягнула 15,8 тысяч. З Расіі завезена ўсяго 100 машын, астатнія — з Еўропы.

Цягам усяго мінулага года было жахліва назіраць за тым, як коштам банкаўскіх пазык паўлічваюцца заробкі, як будуюцца лядовыя палацы і раздаюцца мільённыя доларавыя «стыпендыі» хакейным гульцам. Якія насамрэч добра гуляць ці не ўмеюць, ці не хочуць. Карацей, нават замежныя прафесіяналы ў Беларусі ўсё робяць абы-як. Дарэчы, знакамітыя савецкія фігурысты Белавусава і Пратапопаў, якія некалі з'ехалі за мяжу, не маглі сабе дазволіць раскошы арэндаваць лёд у Швейцарыі. Лёталі трэніравацца ў Канаду, дзе ўсе, звязанае з канькамі, даўно пастаўлена на прамысловую аснову. І таму паслугі каткоў аднолькава танныя, як гэта і належыць тавару, асвоенаму масавай вытворчасцю. А ў нас дзяцей на хакей заганяюць, каб гульцам сумна не было падчас напружаных спаборніцтваў.

Колькі каштуе матч з удзелам галоўнага і лепшага беларускага хакеіста ўсіх часоў, пра гэта лёгка даведацца з жыроўкі, што атрымлівае кожны з нас. Асвятленне, ацяпленне, магутны халадзільнік. Далей так пойдзе — не хопіць нават той энергіі, якую плануюць атрымаць ад мірнага атаму.

І ўсе такія разумнікі, што хоць святло гасі. Лукашэнка даўёў да спадарства глыбокую думку пра тое, што ажыятаж на валютным рынку з 1 ліпеня скончыцца. Бо калі хто захоча набыць легкавік, дастаткова будзе памяняць беларускія рублі на рускія. Мяркуе, што «з налічкай» праблем не будзе?

Як казаў адзін з купалаўскіх дзядзькоў — глупства, пане дабрадзею. Як тая цнота вавілонская.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# У ГДАНЬСКУ — БЕЛАРУСКІ ЛІЦЭЙ

**У Польскім Гданьску 1 верасня 2011 года пачне працу ліцэй. Гэтая навучальная ўстанова будзе спадкаемцам зачыненага ўладамі ў 2003 годзе Беларускага гуманітарнага ліцэя імя Якуба Коласа. У новым ліцэі спалучацца стацыянарная і хатняя формы адукацыі, фінансаваць праект будзе польская дзяржава. Пра новую ўстанову адукацыі журналісту «НЧ» Генадзю Кеснеру распавёў заснавальнік і кіраўнік яшчэ таго, апальнага ліцэя, Уладзімір Колас.**

*— Чыя гэта была ідэя — стварыць ліцэй у Гданьску?*



Уладзімір Колас

— Гэта была супольная ідэя — і гданьскіх партнёраў, і наша. Паколькі стаўленне уладаў да беларускай тоеснасці, да беларускай мовы не мяняецца, дый улады самі не мяняюцца, то трэба было шукаць нейкае выйсце з гэтага становішча. Да таго ж, памянялася заканадаўства, і магчымасцей самастойнага навучання з'яўляецца ўсё менш і менш, таму і было вырашана падтрымаць прэцэдэнт беларускамоўнай адукацыі. Так атрымалася, што гэта будзе ў Гданьску, бо з гэтым горадам нас звязвае сталае супрацоўніцтва, якое ўжо даўно перарасло ў шчырае сяброўства.

Усе прадметы там будуць выкладацца па-беларуску, і ўсе беларускія дзеці, не толькі з Польшчы, але і з усяго свету, у тым ліку і з Беларусі, будуць мець магчымасць паступіць туды, каб атрымліваць ліцэйскую адукацыю еўрапейскага ўзроўню на беларускай мове.

*— Наколькі існуе запатрабаванасць у такім ліцэі менавіта з боку тых маладых людзей, што жывуць у Беларусі?*

— Калі яшчэ засталіся ў Беларусі маладзёны, што маюць патрэбу вучыцца на беларускай мове, калі яшчэ не ва ўсіх знішчана такое жаданне, чым, дарэчы, актыўна займаюцца ў тым ліку і нашы ўлады, то запатрабаванасць будзе. На сённяшні дзень ёсць ужо больш за пяцьдзясят заявак ад тых, хто жадае вучыцца, і калі інфармацыя пра гэты ліцэй пойдзе далей, то колькасць такіх жадаючых, спадзяюся, павялічыцца.

*— Хто будзе выкладаць у новым ліцэі?*

— Гэта будуць выкладчыкі, якія працавалі ў Гуманітарным ліцэі імя Якуба Коласа. Дадаюцца і польскія выкладчыкі-беларусы, напрыклад, Алёна Глагоўская, доктар паліталогіі, якая выкладае ў Гданьскім універсітэце, будуць выкладаць і дактары з Беластоцкага ўніверсітэта, запрошаныя на кантрактнай аснове.

*— Як да ідэі стварэння такога ліцэя паставіліся польскія ўлады?*

— З боку польскіх уладаў гэта вітаецца, я б сказаў, ёсць нават нейкая рамантыка. Ад самага пачатку мы адчувалі вялікую шчырую чалавечую сімпатыю да тых, хто займаецца гэтай беларускай справай. Існуе жаданне дапамагчы, напрыклад, з боку «Зэспула (звяза) школ экалагічнай інжынерыі» і яго дырэктара спадара Аляксандра Нагуцкага, які з часоў нашага знаёмства пачаў вельмі цікавіцца і гісторыяй Беларусі, і сучаснымі падзеямі ў нашай краіне. Ідзе падтрымка і з боку выкладчыкаў і кіраўнікоў адукацыйнага аддзелу Гданьска на ўзроўні кіраўніцтва горада, якое, дарэчы, мае беларускае паходжанне, і з боку міністра адукацыі Польшчы пані Катажыны Халь, якая сама паходзіць з Гданьска і ведала наш ліцэй, калі сама яшчэ працавала ў гданьскім упраўленні адукацыі. Адным словам, ёсць шчырая падтрымка і жаданне дапамагчы.

▸ **ЖАНОЧЫ ДЗЁННІК**

# ЖАРСЦІ ПА ПАГОНАХ

Марыля МЛЫНОЎСКАЯ

**Мужны — муж, мужчына. Такія дзіўныя і салодкія для кожнай жанчыны словы! Напярэдадні выбараў кандыдат у прэзідэнты Андрэй Саннікаў заклікаў дзяўчат шукаць свае другія палавінкі на Плошчы. Незвычайны атрымаўся захад да выбаршчыц, але ён каштаваў яму засценкаў у КДБ.**




У тую ноч інтымныя спатканні здзейсніліся, але скончыліся кепска. Мужчыны на пару з адшукаўшымі іх дзяўчатамі падчас жорсткага разгону былі збітыя, схопленыя і кінутыя за краты. Астатніх, каго выпадкова абмінуў хапун, пазней расшукалі, дапытвалі і катавалі ў КДБ, іх сваякі патрапілі пад віхраслуп гвалтоўныхператрусаў. Практычна ўсе, хто мог кінуць цень на постаць Іхняй Вялікасці, былі пазбаўлены асабістых кампутараў, ноўтбукаў, тэлефонаў і г.д. Гэтыя падзеі я іранічна назвала «днямі адчыненых дзвярэй». Яны нагадалі мне пра недалёкае камуністычнае мінулае.

Тады прадстаўнікі кіруючай наменклатуры заўсёды няблага жылі за кошт нарабаванага ў насельніцтва дабра. І ад пачатку рабаванне прыкрывалася прывабнымі лозунгамі. «Мір — народам!», «Зямля — сялянам!», «Улада — саветам!». Але замест міру камуністы прынеслі войны, у тым ліку па вынішчэнні ўласнага насельніцтва; замест сваёй зямлі сяляне атрымалі калгасы і раскулачванні; саветы ж сталіся ілжэдэмакратычнай абгорткай дыктатуры.

Яшчэ з дзяцінства я добра памятаю, што стаўленне да людзей у міліцэйскай форме было кепскае. Іх баяліся, але не паважалі. На лавах у дворыках бабулі з насцярогай праводзілі позіркам міліцыянераў. Магчыма, помнілі тыя жахі, што масава ўчыняліся прадстаўнікамі ЧК—ДПУ—НКУС, МДБ—КГБ.

Нечаканая дэталь раптам ажывіла ў памяці і той дворык дзяцінства, і тых бабулек на лавачках, і тое ўспрынянне людзей у форме. Трымаю ў руках газету «Работа для Вас». Бачу адразу некалькі абвестак з вакансіямі на пасаду міліцыянта і міліцыянта-кіроўцы. «Няўжо іх не хапае?!» — першая рэакцыя. І другая: «Ого, колькі даброт ім у абмен за спакусу паздзекавацца з людзей ад імя ўлады!» Стабільны заробак, сацыяльныя гарантыі, абмундзіраванне, магчымасць бясплатнага навучання ў вышэйшых і сярэдніх установах МУС Рэспублікі Беларусь з захаваннем заработнай платы! Пенсійнае забеспячэнне — з 45-ці гадоў! Менавіта так: матэрыяльныя даброты за права паздзекавацца, а не за ахову маёй бяспекі.

Я бачыла, як чалавекападобныя ў спецназаўскай форме 19 снежня ля станцыі метро «Плошча Леніна» павалілі на зямлю і



збівалі ў кроў жанчыну сярэдняга ўзросту. Шок ад убачанага, і не магу забыцца: жанчына на снезе, а вакол 7–8 амапаўцаў, з дубінкамі на ўзмах. У народзе кажуць — «мяцелілі». Астатніх людзей, раздробленых на маленькія часткі, адсоўвалі ў метро, і нельга было дапамагчы…

Мая жаночая сутнасць крыкам крычыць: "Як жа гэта так, чаму згвая узброеных мужыкоў збівала паваленую на зямлю, непрытомную жанчыну?» З дзяцінства помню запаветы з мужчынскага кодэксу годнасці: ляжачага не б'юць, біцца са слабейшым — ганьба, жанчыну біць — ты не мужчына». Дык што не так? Збой у сістэме? Ці баевікоў са спецслужбаў заразілі нейкім злаякасным вірусам, і яны не ведаюць, што твораць? Атрафія мозгу і рабская псіхалогія ўшчэнт вытравіла з іх душаў адчуванне мужчынскай годнасці?

Ноччу 19 снежня спецназавец зламаў нагу 22-гадовай Мае Абромчык. Дактары кажуць, што пералом быў прафесійным: білі, каб зламаць. У звязку з гэтай гісторыяй мушу сказаць усім подлым і хлуслівым асобам, якія маюць нахабнасць заяўляць: «А няма чаго было хадзіць. Вас жа папярэджвалі». Мая Абромчык на акцыі 19-га не была, не паспела патрапіць… Больш таго, сярод затрыманых і кінутых у СІЗА ў тую ноч было шмат людзей, якія і блізка не падыходзілі да Плошчы, былі схоплены наводдаль ад яе. Хтосьці па дарозе дадому пасля асабістых спраў, хтосьці на тралейбусным прыпынку.

І яшчэ хачу сказаць тым, хто абраў іншую формулу жыцця, хто скарыўся, схаваў у кішэню свой гонар, хто не рызыкуе заступіцца за сябра ці знаёмага, хто з-за страху перад начальствам галасуе «так, як загадана»: гэта зусім не значыць, што бяда вас абміне, зачэпіцца за кагосьці іншага, «няправільнага», бел-чырвона-белага. У нас зусім неабавязкова мець адметны светапогляд і ўдзельнічаць у палітычным жыцці краіны, каб апынуцца ў турме, быць збітым ці забітым. Калі вы апранулі на вочы ружовыя акуляры, гэта не значыць, што людзі ў форме не павыбіваюць у іх шкло. Узгадаем хаця б дзяўчыну з Рагачова, якую п'яны ўчастковы міліцыянт застрэліў у галаву. Так, яго судзілі. Але здзіўляюць абставіны, якія прадвызначылі гэтую трагедыю. Кампанія міліцыянтаў, адзін з якіх п'яны, са зброяй, спакойна разгульвала сярод мірнага насельніцтва, дыктавала сваю волю.

***

За 16 апошніх гадоў Беларусь заняла вядучае месца сярод краінаў свету па колькасці міліцыянтаў на душу насельніцтва! Стала страшна хадзіць па вуліцах! Нематываваныя напады, затрыманні і арышты па смехатворных і надуманых абвінавачваннях, ліпавыя справы, ілжэсведчанні на судах! На вуліцах на кожным кроку — міліцыянт.

За апошнія 16 гадоў Беларусь заняла лідуючае месца сярод краінаў свету па колькасці крымінальнікаў на душу насельніцтва! Дык чым займаюцца спецслужбы? Абмундзіраваннем і стабільным заробкам дзяржава яшчэ забяспечыць можа, але ж культуру і добрыя манеры штучна не навяжаш! Якімі, напрыклад, нормамі маралі кіраваліся тыя дзяржаўныя злачынцы, якія давялі да самагубства праваабаронцу Яну Палякову? Сапраўды, насілля, хітрасці і подласці трэба было прыкласці шмат, каб прымусіць добрага, светлага чалавека, маладую жанчыну звесці рахунак з жыццём! Ці не жадаюць людзі ў форме і пагонах выконваць свае прамыя абавязкі?!

Некаторыя знаёмыя супакойваюць, кажуць, што ёсць сярод іх і добрыя людзі. Жанчыны, не лямантуйце! Сапраўдныя мужыкі ёсць! Яны адмовіліся ісці супраць свайго народа, адмовіліся збіваць жанчын у кроў, ламаць ім ногі і рукі, ставіць беларусаў на расцяжку ў засценках КДБ!

Яны своечасова скінулі з сябе ганебную форму і атрыбутыку. Гэта мужчыны, якія заўсёды будуць выклікаць захапленне і павагу. Іх імёны ўжо ўвайшлі ў гісторыю.

Уладзімір Барадач, былы кіраўнік Мар'інагорскай брыгады спецназу, — у 1996 годзе выступіў у абарону Канстытуцыі, адкрыта заявіў, што «на Беларусі павінен панаваць не пахан, а Закон», з-за пераследу быў вымушаны з'ехаць у эміграцыю. Аляксандр Класкоўскі, былы міліцыянт — 19 снежня 2010 года на Плошчы спрабаваў стрымаць спецназаўцаў, угаворваў іх не збіваць безабаронных людзей; затрыманы і жорстка збіты, зараз утрымліваецца пад следствам. Юрый Захаранка, былы міністр унутраных спраў Беларусі — адмовіўся парушаць законы, у выніку бясследна знік. Мікола Аўтуховіч, удзельнік афганскай кампаніі — за спробу абірацца кандыдатам у дэпутаты, а таксама за змаганне з карупцыяй у вышэйшых эшалонах улады быў незаконна пакараны па сфабрыкаванай справе і асуджаны да 5 гадоў і двух месяцаў пазбаўлення волі ў калоніі строгага рэжыму, адбывае пакаранне ў Івацэвіцкай калоніі. Мікалай Статкевіч, палкоўнік у запасе, стваральнік і кіраўнік беларускага згуртавання вайскоўцаў, дэмакратычны палітык, кандыдат у прэзідэнты — неаднойчы галадаў у абарону правоў беларусаў, зараз знаходзіцца за кратамі, пад следствам. Мікалай Казлоў, падпалкоўнік міліцыі — адмовіўся ўдзельнічаць у фальсіфікацыях выбараў, патрабаваў распачацця крымінальнай справы па фактах фальсіфікацый на сваім участку. Міхаіл Казлоў, падпалкоўнік міліцыі — займаўся расследаваннем карупцыйных спраў высокапастаўленых чыноўнікаў, быў асуджаны па крымінальнай справе разам з Мікалаем Аўтуховічам і іншыя.

Раней пры знаёмстве з мужчынамі я не цікавілася іх службовым статусам. Гэта для мяне не было прыярытэтным. Калі чалавек інтэлектуальны, прыгожы, цікавы, дык навошта разбірацца ў яго пасадах? І мне шэнціла. Каханыя не насілі пагоны, не былі чыноўнікамі і, тым больш — шасцёркамі, прыслугачамі. Але шмат што змянілася з таго часу. І сёння на знакі ўвагі з боку асоб процілеглага полу мой розум рэагуе сполахам мноства думак: толькі б не міліцыянт, не амапавец, не сябра БРСМ!

Вядома, у кожнай жанчыны — свой адметны густ. Але тупая чалавекападобная істота ў берцах, якая рэагуе толькі на каманду «фас», наўрад ці можа выклікаць хоць нейкую павагу. Пра сэксуальнасць тут лепей памаўчаць. Будзь сабе гэтая істота хоць тройчы ў біцэпсах-трыцэпсах. Бо не сцерці са стужкі свядомасці страшныя кадры, як біяробаты ў чорным, выконваючы каманду «фас», кідаюцца на людзей, збіваюць з ног, збіваюць нагамі і дубінкамі. Няўжо іх саміх ад сябе саміх не ванітуе?

Таму, асобы ў форме і пагонах, скажу вам па сакрэту, калі няма смеласці не выслугоўвацца за грошы, мець чалавечую годнасць, нічога акрамя жалю і агіды вы не выклікаеце. У жанчыны ніколі не ўзнікне жадання спаць з гадам. Дзяржаўнай сістэме такія патрэбны імпатэнтамі. Такімі вы і будзеце, калі не ў наўпроставым, то ў маральным плане. Пакуль не знойдзеце смеласці забіць у сабе гада. Лінгвістыка тут як ніколі дарэчы. У перакладзе з беларускай мовы на рускую слова «гад» азначае «пресмыкающееся, тварь». І тут ёсць толькі чорнае і белае, без аніякіх адценняў. З дакладнасцю па Дастаеўскаму: альбо ты «тварь дрожащая», альбо «право имеешь». Не бывае ў нас так, каб напалову міліцыянер, а напалову супраць гвалтоўнага рэжыму. Бо прынцыпы не дзеляцца.

Ды будуць мужыкі мужчынамі.

## 13 КРАСАВІКА, СЕРАДА

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10, 18.50, 01.45** Зона Х.
**07.30** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Сфера інтэрасаў». Эканамічная праграма.
**09.10-15.00** Тэхнічная прафілактыка
**15.20, 19.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** «OFF STAGE LIFE».
**15.50** Серыял «Ганначка» (Расія).
**16.50** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.50** Крымінальная меладрама «Зацьменне» (Расія - Украіна).
**19.25** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.30** «КЕНО».
**19.35** Зямельнае пытанне.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/4 фіналу. Прамая трансляцыя.
**23.50** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/4 фіналу.
**01.50** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05-16.00** Тэхнічная прафілактыка.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Жаночыя мары аб далёкіх краінах». Шматсерыйны фільм.
**22.15** Фільм «Бачнасць гневу».
**00.25** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**01.20** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**08.40** «Аўтапанарама».
**09.00-15.00** Прафілактыка.
**15.00** Сапраўдная гісторыя. «50 гадоў: палёт нармалёвы».
**15.30** «Паляванне на ізюбра». Серыял.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Дашнікі». Серыял.
**21.30** «Мінск і мінчане».
**22.05** «Дабро пажаліцца».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Паляванне на ізюбра». Серыял.
**23.55** «Водблiскi». Серыял.

### ЛАД

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Меладраматычны серыял «Ты маё жыццё» (Аргенціна).
**09.05-14.50** Тэхнічная прафілактыка.
**14.50** Серыял «Сіла прыцягнення».
**15.45** Канкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
**16.50** Пазакласная гадзіна.
**17.05** Камедыйная меладрама «Анатомія Грэй-5» (ЗША).
**18.00** Меладраматычны серыял «Ты маё жыццё» (Аргенціна).
**19.05** Кінааповесць «Ішоў чацвёрты год вайны» (СССР).
**20.45** Калыханка.
**21.00** Тэлебарометр.
**21.05** Беларуская часіна.
**22.10** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**22.50** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.25** Рэальны свет.
**23.55** Серыял «Анатомія Грэй-5» (ЗША).

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** Прэм'ера. «Прамы эфір».
**10.10** «Пётр Вельямінаў. Цені знікаюць...». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Кедр» пранізвае неба».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «Кедр» пранізвае неба».
**22.20** Тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** Прэм'ера. «Кранштацкі мяцеж. Хто перамог?». Дакументальны фільм.

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Надзвычайнае здарэнне».
**09.00-15.00** Прафілактыка.
**15.15** «Справа густу».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Новае жыццё шпіка Гурава. Працяг».
**23.15** Сёння.
**23.40** Прэм'ера. Дак. цыкл «Наш космас».

### EUROSPORT

**09.30** Экстрэмальныя віды спорту. Freeride Spirit. Часопіс.
**09.45** Аўтагонкі. Сусветная серыя Рэно. Агляд.
**10.15** Спартыўная гімнастыка. Фінал. Берлін (Германія).
**11.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. 53 кг. Жанчыны. Расія.
**12.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. 62 кг. Мужчыны. Расія.
**13.00** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Кітая. Пекін (Кітай). Фінал.
**15.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. 53 кг. Жанчыны. Расія.
**16.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. 58 кг. Жанчыны. Расія.
**17.30** Спартыўная гімнастыка. Мужчыны. Фінал. Берлін (Германія).
**18.15** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. 62 кг. Мужчыны. Расія.
**19.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. 69 кг. Мужчыны. Расія.
**21.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**21.10** Абранае па серадах.
**21.20** Пола. Адкрыты чэмпіянат Барбадос.
**22.20** Навіны коннага спорту.
**22.35** Гольф. Augusta masters.
**23.25** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**23.30** Ветразевы спорт. Чэмпіянат свету. Rolex Farr 40.
**00.00** Яхт-клуб. Навіны ветразевага спорту.
**00.05** «Адкрыцці. Марафон». Часопіс.
**00.10** Усе віды спорту. Часопіс.
**00.15** Гольф-клуб. Навіны гольфа.
**00.25** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**00.30** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. 58 кг. Жанчыны. Расія.
**01.15** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. 69 кг. Мужчыны. Расія.
**02.00** Алімпійскі часопіс.

### БЕЛСАТ tv

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар.
**07.30** «Фальшываманетнікі. Вяртанне «Зграі», серыял: 1 серыя.
**08.20** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 32 серыя.
**09.15** «Піпі Доўгаяпанчоха», серыял: 17 серыя.
**09.45** Праект «Будучыня».
**10.10** Рэпартэр.
**10.35** «Над Нёмнам» (тэлечасопіс).
**10.55** Два на два (тэледыскусія): Калінкіна і Дынько.
**11.25** Навігатар.
**11.40** Асабісты капітал.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Фальшываманетнікі. Вяртанне «Зграі», серыял: 1 серыя.
**12.50** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 32 серыя.
**13.45** «Піпі Доўгаяпанчоха», серыял: 17 серыя.
**14.15** Праект «Будучыня».
**14.40** Рэпартэр.
**15.10** «Сон-трава», канцэрт гурта «Троіца»: ч. 1.
**15.40** «Над Нёмнам» (тэлечасопіс).
**15.55** Два на два (тэледыскусія): Святлана Калінкіна і Андрэй Дынько.
**16.25** Навігатар.
**16.40** Асабісты капітал.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Піпі Доўгаяпанчоха», серыял: 18 серыя.
**17.35** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 1 серыя.
**18.20** Беларусы ў Польшчы.
**18.40** Эксперт.
**19.05** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.15** Сальда (эканамічная праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.20** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**20.35** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**20.40** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Без рэтушы: «Беларуская Амерыка», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**21.45** Два на два (тэледыскусія): Святлана Калінкіна і Андрэй Дынько.
**22.15** «Забытае святло», маст. фільм, 1996 г., Чэхія.
**23.55** Аб'ектыў.
**00.15** Гарачы каментар.

## 14 КРАСАВІКА, ЧАЦВЕР

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.35** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10, 18.50, 01.20** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**11.00** Серыял «Зацьменне».
**12.10** «Папараца». Камедыя (Расія).
**14.15** «OFF STAGE LIFE».
**14.30** Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**15.20, 19.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**15.50** Серыял «Ганначка» (Расія).
**16.50** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.50** Серыял «Зацьменне».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Серыял «Абдуры мяне-2» (ЗША).
**22.55** «Клуб рэдактараў».
**23.45** «Усе дзеці Бога могуць танчыць». Меладрама (ЗША).
**01.25** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50** «Рыжскі гамбіт».
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Жаночыя мары аб далёкіх краінах». Шматсерыйны фільм.
**22.15** Прэм'ера АНТ: «Хто там?». Аналітычная праграма.
**22.45** Камедыя «Скажы «Так».
**00.30** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**01.25** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Дашнікі». Серыял.
**09.30** «Дабро пажаліцца».
**09.50** «Вялікі горад».
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Турысты». Серыял.
**14.40** «Рэдакцыя». Серыял.
**15.30** «Паляванне на ізюбра». Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Дашнікі». Серыял.
**21.30** «Праўда».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Паляванне на ізюбра». Серыял.
**23.55** «Водблiскi». Серыял.

### ЛАД

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.40** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.40** Кінааповесць «Ішоў чацвёрты год вайны» (СССР).
**11.15** Бітва экстрасэнсаў.
**12.15** Дача здароўя.
**12.45** Жансавет.
**13.15** «Ты-тое, што ты ясі». Аздараўленчая праграма (Расія).
**13.50** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**14.50** Серыял «Сіла прыцягнення».
**15.45** Канкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
**16.50** Пазакласная гадзіна.
**17.05** Серыял «Анатомія Грэй-5» (ЗША).
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** Хакей. КХЛ. Плэй-офф. Фінал. Матч 4-ы. У перапынку: Калыханка.
**21.30** Тэлебарометр.
**21.35** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**22.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/4 фінала. Прамая трансляцыя.
**00.00** Час футболу.
**00.30** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Агляд дня.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** Прэм'ера. «Прамы эфір».
**10.10** «Ірына Антонава. Мемуары». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Кедр» пранізвае неба».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «Кедр» пранізвае неба».
**22.20** Тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** «Паядынак».

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Следства вялі…».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Баль на ўвесь свет».
**11.20** «Таямнічая Расія».
**12.05** «Да суду».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Пракурорская праверка».
**14.25** «Давайце мірыцца!».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.55** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Спартак (Расія) - Порту (Партугалія). Прамая трансляцыя.
**21.55** «Вочная стаўка».
**23.00** Сёння.
**23.25** Прэм'ера. Дак. цыкл «Наш космас».

### EUROSPORT

**09.30** Снукер. Мастэрс. Лондан (Англія).
**11.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. 58 кг. Жанчыны. Расія.
**12.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. 69 кг. Мужчыны. Расія.
**13.00** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Уэльса. Ньюпарт.
**15.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. 58 кг. Жанчыны. Расія.
**16.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. 63 кг. Жанчыны. Расія.
**17.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**18.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. 69 кг. Мужчыны. Расія.
**19.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. 77 кг. Мужчыны. Расія.
**21.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**21.10** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Румынія.
**00.00** Вось дык так!!!
**00.15** Пра рэслінг. Агляд WWE.
**00.50** Пра рэслінг. Vintage Collection. ЗША.
**01.45** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. 77 кг. Мужчыны. Расія.

### БЕЛСАТ tv

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар.
**07.30** «Забытае святло», маст. фільм, 1996 г., Чэхія.
**09.10** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 1 серыя.
**09.55** «Піпі Доўгаяпанчоха», серыял.
**10.25** На колах.
**10.55** Без рэтушы: «Беларуская Амерыка», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**11.15** Эксперт.
**11.40** Сальда (эканамічная праграма).
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 1 серыя
**12.45** Канцэрт гурта «N.R.M.»: ч. 1
**13.50** «Піпі Доўгаяпанчоха», серыял.
**14.15** На колах.
**14.40** Без рэтушы: «Беларуская Амерыка», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**15.05** Эксперт.
**15.30** Госць «Белсату».
**15.45** Сальда (эканамічная праграма).
**16.00** Навігатар.)
**16.10** Беларусы ў Польшчы.
**16.25** Два на два (тэледыскусія): Святлана Калінкіна і Андрэй Дынько.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Школа на санцапёку», серыял.
**17.30** «Забытае святло», маст. фільм, 1996 г., Чэхія.
**19.10** Маю права (прававаая праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.25** Невядомая Беларусь: «Як пушчу стралу», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**21.50** Форум (ток-шоу): «Па-за законам».
**22.30** «Пўаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 1 серыя.
**23.30** Аб'ектыў.
**23.55** Гарачы каментар.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 17 КРАСАВІКА, НАДЗЕЛЯ

**07.55** Мультфільм.
**08.50** Слова Мітрапаліта Філарэта.
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** «Арсенал».
**09.40** У свеце матораў.
**10.15** «Культурныя людзі».
**10.45** Камедыйны серыял «Сваты-4».
**12.10** «Ах, вадэвіль, вадэвіль...» Музычная камедыя (СССР).
**13.40** «Ведай нашых: Пётр Клімук».
**13.50** Сінематэка.
**14.35** Зямельнае пытанне.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Пункт звароту». Дэтэктыўная меладрама (Расія-Украіна).
**18.05** Суперлато.
**19.15** Камедыйны серыял «Вясковая камедыя» (Расія). Заключная серыя.
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.50** «КЕНО».
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**22.30** «М+Ж». Рамантычная камедыя (Расія).

**07.00** «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь (з субтытрамі).
**09.20** Камедыйным серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.15** Фазэнда.
**11.50** «Ранішняя пошта».
**12.25** «Прыгоды Фліка». Анімацыйны фільм.
**14.05** «Брэйн рынг».
**15.05** «Гарады-героі. Адэса».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Давай ажэнімся!».
**17.25** «Эстрадны кактэйль».
**18.45** АНТ прадстаўляе: Тэніс. Кубак Федэрацыі. Агляд.
**20.00** Контуры.
**21.05** Меладрама «Другое жыццё Фёдара Строгава».
**22.55** «Yesterday live».
**23.55** Фільм «Мара Касандры».

**06.05** Фільм «Міхайла Ламаносаў. У славу айчыны». СССР, 1986 г. Заключная серыя.
**07.25** Фільм «З Парыжу з каханнем». Францыя, 2009 г.
**09.00** СТБ прадстаўляе: «Гаворыць і паказвае Мінск».
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**13.20** «Добры дзень, доктар!».
**13.55** Фільм «Гісторыя Асі Клячынай, якая кахала, ды не выйшла замуж». СССР, 1966 г.
**15.35** Ток-шоў «Лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Праўда».
**17.30** Канцэрт М. Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Прывітанне - пакуль». Францыя - Італія - Ізраіль, 2008 г.
**22.35** «Прафесійны бокс».
**23.25** Фільм «Чорная ружа - эмблема смутку, чырвоная ружа - эмблема кахання». СССР, 1989 г.
**01.45** «Спецпрызн». Серыял.

**07.45** Дабравест.
**08.10** Мір вашай хаце.
**08.25** Музычная камедыя «Элвін і бурундукі-2» (ЗША).
**10.05** Медычныя таямніцы.
**10.50** Медычныя таямніцы +.
**11.00** Школа рамонту.
**12.10** Тэлебарометр.
**12.15** Нашы тэсты.
**12.55** Кінаспробы.
**13.15** «Правы чалавека».
**13.35** Бухта капітанаў.
**14.10** Прыгодніцкая кінааповесць «Прыдатны да нестраявой» («Беларусьфільм»).
**15.55** Сямейная камедыя «Ведаць бы, што я геній» (ЗША).
**17.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Арсенал-Ліверпуль. Прамая трансляцыя.
**19.55** Канкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
**21.00** «Навіны надвор'я».
**21.30** Смешная часіна.
**22.05** Спартовая драма «Руда і Курсі» (ЗША-Мексіка).
**00.05** Культасвет.

**РОССИЯ**

**07.00** Мультфільмы.
**07.20** Тэлесерыял «Сваты-4».
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** Прэм'ера. «З новай хатай!».
**12.20** Мультфільм.
**12.30** Фільм «Таямніца залатой гары».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.45** «Рамантыка рамансa».
**15.35** «Гарады і Весі».
**16.35** Фільм «Родная кроў».
**18.20** Прэм'ера. Юбілейны вечар Алега Міцяева».
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** Прэм'ера. «Танцы з Зоркамі». Сезон - 2011.
**23.50** Фільм «Уварванне».

**НТВ**

**07.30** Мультфільм «Кацяня з імем Гаў».
**08.00** Сёння.
**08.20** «У зоне асаблівай рызыкі».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Першая перадача». Аўтамабільная праграма.
**10.50** «Баль на ўвесь свет».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Таямнічая Расія».
**14.10** «Апошняе слова».
**15.10** «Сеанс з Кашпіроўскім».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Гісторыя ўсерасійскага зману».
**17.20** «І зноў добры дзень!».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне». Агляд за тыдзень.
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.55** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**22.05** Меладрама «Нью Йорк, я люблю цябе».
**00.05** «Увага: вышук!».
**00.40** «Нерэальная палітыка».
**01.10** «Футбольная ноч».

**EUROSPORT**

**09.30** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд. Дзень 1-ы.
**11.00** Лёгкая атлетыка. Марафон. Лондан.
**14.00** Супербайк. Часопіс.
**14.15** Суперспорт. Чэмпіянат свету. Каралеўства Нідэрландаў.
**15.15** Аўтагонкі. Сусветная серыя Рэно. Іспанія.
**16.15** Веласпорт. Amstel gold race.
**18.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд. Дзень 2-і.
**19.30** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. 105 кг. Мужчыны. Расія.
**21.00** Конны спорт. Канкур. Гран-пры. Парыж (Францыя).
**22.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд. Дзень 2-і.
**00.00** Супебайк. Чэмпіянат свету. Каралеўства Нідэрландаў.
**00.30** Супебайк. Чэмпіянат свету. Каралеўства Нідэрландаў.
**01.00** Ралі. Міжкантынентальны ралійны чэмпіянат. Гран Канарыя (Канарскія выспы). Агляд.
**01.30** Матаспорт. Часопіс. Агляд падзей тыдня.
**01.45** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд. Дзень 2-і.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.15** Еўропа сёння.
**07.40** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 7 серыя.
**08.25** «Машына зменаў», тэлесерыял.
**08.55** Калыханка для самых маленькіх.
**09.25** Форум (ток-шоу): «Па-за законам».
**10.10** «Права быць свабодным» (канцэрт альтэрнатыўнай музыкі Луцк-2007): выступ гурта «Індыга».
**10.35** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**10.45** «Адэскія матывы», дак. фільм, 2008 г., Украіна.
**11.10** «Байкал», дак. фільм, 2010 г. Польшча.
**11.35** «Падзенне жалезнай заслоны», дак. фільм: 2 серыя, «Абвінаваўца Чаўшэску».
**12.30** Еўропа сёння.
**13.00** «Машына зменаў», тэлесерыял.
**13.25** Калыханка для самых маленькіх.
**14.00** «Нагаворнае зелле нумар дзевяць», камедыя, 1992 г., ЗША.
**15.35** Два на два (тэледыскусія): Юрый Хашчавацкі і Яраслаў Раманчук.
**16.05** «Ранча», серыял: 50 серыя.
**17.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.15** «Час гонару», серыял: 25 серыя.
**18.05** Дакументальная гадзіна: «Рэвалюцыя: сем месяцаў хаосу», дак. фільм, 2007 г., Францыя.
**19.00** Канцэрт «Крамбамбулі»: «Белая яблыня грому»: ч. 3.
**19.30** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**20.05** ПраСвет.
**20.30** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма).
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**22.00** Фільматэка майстроў: «Была ці не была?», камедыя, 2006 г., Румынія.
**23.25** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**23.35** Тыдзень у «Аб'ектыве».

# Шаноўныя чытачы!

**На жаль, газету «Новы час» немагчыма набыць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца можна на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ААО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029) 604 34 57, Юрый;
Віцебск: (8 029) 308 49 78, Юрый;
Мінск: (8 029) 968 79 73, Аляксей;
(8 029) 178 31 68, Вольга.

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 _____________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Паважаныя чытачы!

З 1 студзеня 2011 года падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл: (8 029) 651 21 12.**

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

Период подписки указывает абонент

Плательщик

Пеня ________

Кассир Всего ________

**Для тых, хто прымае рашэнні!**
Новы час
www.novychas.org

ПАРТЫІ

# ФРОНТ LIGHT

Алег НОВІКАЎ

**Дэбют Марыны Ле Пэн у якасці старшыні партыі пераўзышоў усе чаканні. Аднак выклікаў рост супярэчнасцей унутры арганізацыі.**

Па выніках выбараў у кантонах, якія прайшлі ў Францыі ў сакавіку, Нацыянальны Фронт у сярэднім набраў 15 працэнтаў, што на 4 працэнты лепш за мінулыя выбары. Аднак трэба прызнаць, што рэкорду 2002 года, калі партыя атрымала 17 працэнтаў галасоў, дасягнуць не ўдалося. Што тычыцца праціўнікаў, то першымі прыйшлі сацыялісты — 25 працэнтаў. Вялікую катастрофу перажыла ўрадавая партыя галістаў, якую падтрымалі толькі 17 працэнтаў.

У самы разгар выбарчай кампаніі Нацыянальны Фронт нечакана стаў фігурантам рэзананснага скандалу — Аляксандр Габрыяк, адзін з франтаўскіх кандыдатаў, сфатаграфаваўся на фоне сцягу Трэцяга Рэйху з выкінутай уперад рукой.

Скандал лакалізаваць не ўдалося, хаця ў Аляксандра аператыўна адабралі партбілет. Амаль усе буйныя партыі і грамадскія арганізацыі асудзілі Нацыянальны Фронт. Па іх словах, сваёй выхадкай Габрыяк прадэманстраваў сапраўдную нацысцкую прыроду партыі.

Тое, што канкурэнты скарыстаюцца інцыдэнтам, каб асудзіць Марыну Ле Пэн, было відавочна. У сакавіку рэйтынг старшыні НФ нечакана пайшоў уверх і зблытаў планы як Сарказі, так і апазіцыі.

Перш за ўсё, быў парушаны алгарытм прэзідэнцкіх выбараў 2012 года. Яшчэ ўчора лічылася, што гэта будзе супрацьстаянне Сарказі і прадстаўніка сацыялістаў. Цяпер сітуацыя больш інтрыгоўная. Калі верыць некаторым выданням кшталту «Le Parisien», папулярнасць Марыны Ле Пэн складае каля 23 працэнтаў. І гэтага цалкам дастаткова, каб быць у другім туры.

Асабліва палохае сцэнар, калі Ле Пэн апынецца ў другім туры з сацыялістам. Пры такіх раскладах за яе можа прагаласаваць увесь правы электарат. Перамога лідара НФ — міна пад усе дзяржаўныя інстытуты. Менавіта таму вялікі інтарэс на апошніх выбарах выклікалі тыя ўчасткі галасавання, дзе ў другім туры змагаліся сацыялісты і нацыяналісты. Нацыяналісты, праўда, паўсюдна прайгралі, аднак розніца, як правіла, была невялікая — 5–10 працэнтаў.





Між тым, адным з самым заўважных удзельнікаў кампаніі вакол інцыдэнту з нацысцкім салютам нечакана сталі прафсаюзы. Вось каму, здавалася, сямейка Ле Пэн абсалютна не цікавая. На працягу стагоддзя правыя партыі разглядалі прафсаюзы як зло per essence. У 1990-я гады на хвалі крызісу СССР і французскай кампартыі Нацыянальны Фронт паспрабаваў замацавацца ў пралетарскім асяроддзі. Былі створныя асяродкі НФ на чыгунцы і ў пастарунках паліцыі, але ў выніку эксперымент праваліўся.

Апошнім часам сітуацыя мяняецца. 10 сакавіка ў Парыжы Луі Аліёт, намеснік Марыны Ле Пэн, абвясціў пра стварэнне новага прафсаюзнага цэнтра — Нацыянальнага аб’яднання абароны працоўных сяброў прафсаюзаў. «Сутыкнуўшыся з унутранай палітычнай дыскрымінацыяй, якую практыкуюць некаторыя прафсаюзныя арганізацыі, я прыняў рашэнне пра стварэнне асацыяцыі абароны сацыяльных і прававых інтарэсаў іх ахвяр», — кажа Луі.

Маюцца на ўвазе пацярпелыя ад зачысткі, якую ўвосень-зіму правялі пяць буйных прафсаюзаў краіны: Force Ouvriere, CGT, CFDT, Sud, Nursa. З шэрагаў пералічаных сіндыкатаў былі выключаныя ўсе сябры Нацыянальнага Фронту, якія правялі жаданне пайсці на кантанальныя выбары. Выключэнне нацыяналістаў тлумачылася прафсаюзнымі бонзамі неабходнасцю супрацьстаяць канцэпцыі дыскрымінацыі, якую, па іх словах, практыкуе Нацыянальны Фронт.

«Адмаўленне іншага, ідэя зачынення межаў, тэзіс пра тое, што эмігранты адказныя за ўсе праблемы, можа завесці наша грамадства ў крызіс», — адзначалася ў сумеснай заяве пяцёркі. Прафсаюзы таксама выступілі супраць спроб інструменталізацыі рабочага руху з боку ультраправых.

Хаця чыстка нацыяналістаў у прафсаюзах, па вялікім рахунку, закранула максімум чалавек дзесяць, прыменшваць яе значнасць не варта. Як паказалі вынікі сакавіцкіх выбараў, прафсаюзы правільна ацанілі тэндэнцыі і нанеслі прэвентыўны ўдар.

Аналізуючы электаральную карту, відавочна, што Нацыянальны Фронт набірае пункты менавіта ў працоўных рэгіёнах. Прычым партыя атрымлівае на працоўнай Поўначы нават больш, чым на Поўдні. У дэпартаменце Nord-Pas-de-Calais кандыдаты НФ атрымалі ў сярэднім больш за 30 працэнтаў. Тут Нацыянальны Фронт цалкам адабраў у галістаў званне галоўнага праціўніка левых.

Сацыёлагі лічаць, што поспех Марыны Ле Пэн у працоўным асяроддзі цалкам лагічны. Фронт апошнім часам катэгарычна адмовіўся ад ліберальных канцэпцый Рэйгана і Тэтчэр, з якімі насіўся бацька Марыны. Іх месца акупаваў больш сацыяльны сямейны дыскурс. Марына не скупіцца на самыя фантастычныя абяцанкі — збіраецца ліквідаваць усе гіпермаркеты, марыць нацыяналізаваць усе прыватныя банкі і вывесці краіну з зоны еўра. «Глабалізм — гэта другая пасля ісламізму таталітарная дактрына XXI стагоддзя», — кажа яна.

Прыцягнуць увагу працоўных да Нацыянальнага Фронту дапамог унутраны крызіс у асяроддзі вядучай апазіцыйнай партыі: сацыялісты хранічна не могуць аб’яднацца вакол якой-небудзь адной фігуры. Прэзідэнцкая кампанія наўрад ці будзе выключэннем. На цяперашні момант як мінімум чатыры чалавека ўжо аспрэчваюць тытул адзінага кандыдата. Між тым, фонам расколу сярод левых з’яўляецца эканамічны крызіс, які выклікаў запыт на сацыяльныя і антыглабалісцкія канцэпты, што якраз прапануе Марына Ле Пэн.

З іншага боку, імідж выключна сацыяльнай партыі Марыне не патрэбны. Яна павінна лічыцца з пазіцыяй партыйных ветэранаў, якія з 1970-х гадоў традыцыйна прытрымліваюцца антыкамуністычных поглядаў. Левы ўхіл дае падставу Сарказі маргіналізаваць Нацыянальны Фронт у вачах правых, кансалідуючы свой электарат. Дый самі левыя выбаршчыкі не так актыўна перабягаюць да Ле Пэн, як правыя. Адпаведна апытанням, толькі 9 працэнтаў сяброў тых жа прафсаюзаў гатовыя галасаваць за Нацыянальны Фронт.

Сама Марына кажа, што яна бачыць будучае партыі ў фармаце «Нацыянальны Фронт light». Стаўка робіцца хутчэй на ўспрыманне Нацыянальнага Фронту як новага тавару на палітычным рынку. Аднак ужо зараз можна прадказаць рост канфліктаў унутры партыі. Занадта ўжо супярэчлівая рыторыка мадам Ле Пэн, якая выступае за аборты і адначасова кажа, што студэнцкая рэвалюцыя 1968 года (пасля якой тэма абортаў стала часткай палітычнай дыскусіі) — «вялікая трагедыя французскай гісторыі».

Дарэчы, выхад Марыны Ле Лэн на палітычную арэну прыйшоўся на прэм’еру фільму «Potuche» вядомага рэжысёра Франсуа Азона. Яго гераіня (актрыса Катрын Дэнёў) — пажылая мадам, якая адначасова кідае выклік свайму мужу-лібералу, дырэктару завода і былому каханку-камуністу, мэру. Кульмінацыяй карціны становіцца ўдзел мадам у парламенцкіх выбарах, на якіх, спекулюючы на вобразе маці для ўсіх, яна перамагае камуніста. Толькі гераіня Катрын Дэнёў старэй за Марыну, якой у гэтым годзе споўніцца 43 гады.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Версія пра тое, што кандыдатаў і актывістаў іх штабоў 19 снежня беларускія ўлады захапілі ў якасці закладнікаў, знаходзіць усё больш доказаў. Закладнікаў можна памяняць на прызнанне выбараў, адмену санкцый і, натуральна, грошы. Апошняе Лукашэнку неабходна больш за ўсё. Грошай у Беларусі няма, і атрымаць іх намагаюцца, як заўсёды, з Расіі. А паколькі пытанне з расійскай дапамогай завісла, Бацька, здаецца, згадаў любімы метад — гульню з Еўропай. А Еўропа свае патрабаванні агучыла яшчэ напрыканцы снежня — свабода для апазіцыянераў. На свабоду сваіх апанентаў Бацька, зразумела, не адпусціць, яны патрэбныя на крайні выпадак. Тэрміны для апазіцыянераў змякчаюць больш малымі порцыямі. 30 сакавіка перагледзелі справы для шасці чалавек. Цяпер знялі з кручка яшчэ чацвярых. Чакаюць, хто першы сігнал падасць: Расія ці Еўропа.

**«Московский Комсомолец» (Расія)**

У мяне былі меркаванні наконт камуністычнай Чэхаславакіі, але зараз я думаю, наколькі яны адпавядалі рэчаіснасці. Мне здавалася, што ў Чэхаславакіі за людзьмі сачылі, іх пераследавалі, яны маглі страціць працу ці застацца без падвышэння па службе — звычайнае меню таталітарнай сістэмы, — але мне здавалася, што турмы не былі перапоўненыя палітычнымі дысідэнтамі так, як у Беларусі. Нешматлікіх дысідэнтаў сурова каралі, але масавай абуранасці не было. Пры савецкай сістэме не было пазасудовых распраў. Гэта было пытанне ідэалогіі і падпарадкавання ёй. А ў Лукашэнкі няма ідэалогіі, а ёсць бізнэс-план.

**«The Observer» (Вялікабрытанія)**

У канцы мінулага тыдня сходы акцыянераў двух гродзенскіх прадпрыемстваў — «Гродна-Азот» і «Гродна-Хімвалакно» — прынялі рашэнне пра аб’яднанне. Гэта спарадзіла ў асяроддзі экспертаў чуткі пра будучы продаж гэтага комплексу. Размовы пра продаж «Гродна-Азоту» паўсталі пасля таго, як дырэктарам канцэрну прызначылі расіяніна Ігара Жыліна. Цяпер, калі Нацбанк па сутнасці прызнаецца, што фінансава-эканамічная стабільнасць залежыць ад вонкавых паступленняў, пытанне продажу «фамільнага срэбра» набывае адмысловую актуальнасць. Урад і Нацбанк сцвярджаюць, што неўзабаве атрымаюць крэдыт у 3 мільярда долараў. (1 мільярд — дзяржкрэдыт Расіі і 2 мільярда — з антыкрызіснага фонду ЕЎРАЗЭС). Але эксперты мяркуюць, што крэдытаў без прыватызацыі не будзе.

**«Независимая газета» (Расія)**

У Беларусі заканчваюцца грошы, і людзі цэлымі днямі стаяць у чэргах, каб абмяняць рублі ў чаканні чарговай дэвальвацыі. Але паколькі Захад адмовіўся мець справы з апошняй дыктатурай Еўропы, Расія можа зараз дыктаваць ёй свае ўмовы ў абмен на фінансавы выратавальны круг. Лукашэнка пачынае разумець, што пляснуўшы дзвярамі ў твар Захаду, ён вырак сябе на ўмовы, якія яму будзе дыктаваць Крэмль. У значнай меры праблема складаецца ў тым, што беларуская эканоміка пры Лукашэнку мала развіваецца, паколькі ўсё 17 гадоў знаходжання ва ўладзе ён кіруе па сутнасці савецкай дзяржавай. Лукашэнка душыць прыватнае прадпрымальніцтва, і каля 80 працэнтаў прамысловасці знаходзіцца ў руках дзяржавы. Ёсць і альтэрнатыва, якая палягае ў дэвальвацыі рубля. Большасць эканамістаў рэкамендуе правесці дэвальвацыю ў межах 40%. Урад на мінулым тыдні зрабіў крок у гэтым кірунку, дазволіўшы банкам гандляваць рублямі на 10% вышэй афіцыйнага курсу. Але любая больш рэзкая змена будзе вельмі непапулярнай, хаця давер да беларускай валюты і без таго валіцца.

**«The Washington Times» (ЗША)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ПОЛЬШЧА. У КОЖНАГА СВОЙ ПОМНІК



Марэк Сускі, дэпутат Сейму, сябра кансерватыўнай партыі «Права і Справядлівасць» (PiS), выставіў уладам Варшавы ўльтыматум. PiS патрабуе адпаведным чынам ушанаваць памяць прэзідэнта Леха Качыньскага і яго жонкі, якія загінулі год таму ў авіякатастрофе пад Смаленскам. «Адпаведным чынам» значыць, па словах Марэка Сускага, адчыніць помнік Качыньскім каля прэзідэнцкага палацу. Адсутнасць манументу, кажа дэпутат, будзе значыць тое, што кіручая ў Варшаве ліберальная партыя «Грамадзянская Платформа» нейкім чынам звязаная з катастрофай.

У сталічнай ратушы заявы PiS выклікалі здзіўленне. Мэр Варшавы Ганна Гранкевіч-Вальц звяртае ўвагу на тое, што раней PiS патрабавала паставіць помнік усім ахвярам трагедыі. Таксама мэр згадвае пра тое, што ў маі ў Варшаве пройдзе рэферэндум па пытанні, ці патрэбны гораду помнік ахвярам 10 красавіка 2010 года. Аднак нават у выпадку, калі варшавякі скажуць «так», будаўніцтва помніка ў гістарычным цэнтры, дзе месцяцца прэзідэнцкі палац і ратуша, катэгарычна выключана. У сваю чаргу, кансерватары без санкцыі ратушы збіраюцца пабудаваць помнік ахвярам Смаленску. Ці будзе PiS акрамя помніка ўсім ахвярам катастрофы будаваць яшчэ і помнік асабіста Качыньскім? Дададзім, што на магілках ахвяр смаленскай трагедыі ўжо есць адзін манумент.

**Па матэрыялах польскай прэсы**

### УКРАІНА. МІЛІЦЫЯ СТАНЕ ПАЛІЦЫЯЙ

Пасля Расіі адмовіцца ад міліцыі вырашылі і ва Украіне. У Вярхоўнай Радзе рыхтуецца адпаведны законапраект. Па меркаванню дэпутатаў, не трэба баяцца, што слова «паліцэйскі» будзе асацыявацца ў народа з паліцаямі часоў Вялікай Айчыннай. «Гэта былі цывільныя людзі, якія служылі фашыстам, і атаясамленне іх з паліцыяй незалежнай Украіны амаль праз 70 гадоў пасля гэтых падзей выглядае дзіўна», — кажа адзін з аўтараў дакументу. Між тым, у шэрагах МУС ад ідэі з паліцыяй не ў захапленні. «Мільёны людзей, выгадаваных на вершы пра дзядзю Сцёпу-міліцыянера з жахам даведваюцца, што ён быў паліцаем...» — пракаментаваў адзін з генералаў міліцыі ініцыятыву наконт перайменавання. Іншыя генералы прызнаюць, што слова «міліцыя» ва Украіне стала сімвалам карупцыі, і згодныя пачаць усё з чыстага аркушу. Галоўнай часткай рэформы стане высокі заробак паліцэйскіх. У сярэднім украінскі паліцэйскі будзе атрымліваць больш за тысячу долараў. Прэзентацыя законапраекту, а таксама формы ўкраінскіх паліцэйскіх адбудзецца 15 мая.

**Па матэрыялах украінскай прэсы**

### ПОЛЬШЧА. ЗНОЙДЗЕНЫ 170 ТЫСЯЧ НЯМЕЦКІХ ШПІЁНАЎ

Яраслаў Качыньскі, лідар партыі «Права і Справядлівасць», выкрыў цэлую сетку нямецкай пятай калоны. Імі аказаліся 170 тысяч польскіх грамадзян, якія лічаць сябе сілезцамі. Па словах Качыньскага, «прыналежнасць да сілезскага руху — пераходны стан ад паляка да немца». Заява кансерватыўнага лідара выклікала безліч пратэстаў. Перш за ўсё пратэстуе нямецкая меншасць і актывісты Руху за аўтаномію Сілезіі (RAS), які, дарэчы, мае фракцыю ў сілезскім парламенце. Пры гэтым RAS не толькі пратэстуе, аднак і звяртае ўвагу на тое, што Варшава дасюль не прызнала права сілезцаў называць сябе сілезцамі. Між тым, лідар RAS некалькі гадоў таму сапраўды прызнаў, што сілезская ідэнтычнасць — гэта крок у бок ад польскасці. Цяпер ён кажа, што яго няправільна зразумелі. Таксама варта згадаць, што RAS марыць пра аднаўленне сілезскай аўтаноміі, якая існавала ў 1920–1940-х гадах. Афіцыйнымі мовамі ў аўтаноміі былі нямецкая і польская.

**Па матэрыялах польскай прэсы**

### РАСІЯ. ГАННА ЧАПМАН ДАСТАЛА РАСІЯН



Бясконцае мітусня вакол Ганны Чапман пачала выклікаць адмоўную рэакцыю расійскага грамадства. Чапман, нагадаем, былая «шпіёнка», якую выслалі з ЗША. Па вяртанню на радзіму яе чакаў фурор. Яна ўзначаліла пракрамлёўскі моладзевы рух «Маладая гвардыя». Ужо зараз зразумела, што ўвосень яна трапіць у Дзяржаўную Думу па спісах «Адзінай Расіі». Яе выявы, у тым ліку ню, публікуюць самыя крутыя глянцавыя часопісы. Адзін з банкаў узяў яе на працу з вольным графікам. Між тым, здаецца, праслаўленне экс-агента грамадству надакучвае. Больш таго, пачалі сцвярджаць, што Ганна ніякая не шпіёнка. «Калі б Чапман была ўладальніцай нейкіх сакрэтаў, хіба ёй дазволілі б швэндацца па маскоўскіх тусоўках? Які подзвіг яна здзейсніла? Чым праславілася?» — задаюцца пытаннем некаторыя. Іншыя ідуць яшчэ далей: «За што ёй такая вар'яцкая ўвага, лаўры і пашана? За прыгажосць!» Усё часцей высоўваецца версіі пра тое, што Ганна — каханка нейкага крамлёўскага чыноўніка. Між тым, сам аб'ект плётак збіраецца прыняць новы тытул. Па чутках, у бліжэйшы час яе афіцыйна абвесцяць сэкс-сімвалам «Адзінай Расіі».

**Па матэрыялах расійскіх СМІ**

---

ВЫБАРЫ

# АПОШНІ РАЗ НАЗАРБАЕВА?

**У Казахстане Нурсултан Назарбаеў чарговы раз стаў прэзідэнтам. Ці адрозніваліся гэтыя выбары ад папярэдніх? Ці рыхтуе прэзідэнт сабе пераемніка? Пра гэта журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з казахскім журналістам Айнурам Курбатавым.**





***— У чым асаблівасць цяперашніх выбараў?***

— Галоўная іх асаблівасць у тым, што выбараў па сутнасці і не было. Апазіцыя адмовілася высоўваць сваіх кандыдатаў. А тыя тры суперніка, што спешна знайшлі Назарбаеву, практычна невядомыя большасці казахаў, нягледзячы на тое, што двое з іх ужо і раней выкарыстоўваліся ў якасці «шырмы» і набіралі па 2–3%. Досыць было паглядзець на іх выбарчую кампанію: адзін пасадзіў дрэўца, іншы накарміў бабуль, трэці праспяваў песеньку — і гэта ўсё. Што казаць, калі Гані Касымаў, высунуты ад партыі Патрыётаў, прызнаўся, што накідаў перадвыбарную праграму за адну ноч, а эколаг Мэлс Елеўсізаў неадназова прызнаваў, што ён ні на што не разлічвае, а ў дзень галасавання дэманстратыўна аддаў свой голас за Назарбаева? Ён нават сам сабе не верыць. Вось і атрымалі яны свае 1–1,5%. Што гэтым разам было прынцыповым для ўлады, дык гэта забяспечыць яўку. Тым больш што апазіцыя заклікала насельніцтва да байкоту. І калі звычайная практыка для Казахстана — 40–50% яўкі выбаршчыкаў, то на гэты раз дацягнулі да 90%.

***— Дзяржава дала магчымасць выступіць гэтым кандыдатам у дзяржаўных СМІ. Як на гэта рэагавалі людзі?***

— Гэтым разам СМІ ахвотна асвятлялі выбарчыя кампаніі ўсіх кандыдатаў. Нават, па афіцыйных дадзеных, нібыта асобу Назарбаева асвятлялі нават менш, чым астатніх (што, вядома ж, не так)… Але як гэта паказалі? Людзі разумелі, што іх дураць, і ўспрымалі трох супернікаў Назарбаева як групу блазанаў, якіх выклікалі легітымізаваць працэс. Сур'ёзна да іх ставіцца было немагчыма. Вось характэрныя прыклады: Мэлс Елеўсізаў ходзіць па дварах і склікае народ па рупары на сустрэчу з ім, а ніхто не ідзе. Ці камуніст Ахметбекаў праводзіць мітынг у Алма-Аце, на які збіраецца 30 бабулек. Гэта паказчык ці дыягназ?

***— Вынікі выбараў фальсіфікаваліся ці не? Які рэальны сегмент прыхільнікаў Назарбаева?***

— Гэтым разам нават не давялося фальсіфікаваць вынікі выбараў. Народ і сам разумеў, што альтэрнатывы няма. Але затое ў масавым парадку фальсіфікавалі яўку выбаршчыкаў, таму што нават нягледзячы на ўсе пагрозы на адрас дзяржслужбоўцаў і студэнтаў, падкуп (латарэі, раздачу прадуктовых пакетаў) яўка была ўсё ж ніжэй заяўленай — не больш за 60–70%. Што тычыцца сегмента прыхільнікаў Назарбаева, думаецца, пры цяперашніх умовах свае 60% ён бы мог атрымаць сумленна.

***— Як насельніцтва паставілася да выбараў? Калі казаць пра феномен палітычнай апатыі, што змянілася тут за апошні час?***

— Апатыя засталася, і ўсё ж насельніцтва стала больш актыўным. Толькі за адзін месяц людзі здзейснілі тры шэсці на Астану — адно скончылася сутыкненнем з АМАПам, калі 500 чалавек спрабавалі прарвацца ў адміністрацыю прэзідэнта для сустрэчы з кандыдатам Назарбаевым. Так што варушэнні пачаліся, і ў адміністрацыі прэзідэнта пра гэта выдатна ведаюць.

***— Ці разглядаўся ў грамадстве «туніскі варыянт». Ці ёсць цікавасць у краіне да падзей у Паўночнай Афрыцы?***

— У Казахстане народ жыва цікавіцца ўсім, што адбываецца ў свеце, і ў тым ліку арабскімі падзеямі. І так званы «туніскі варыянт» таксама не выключаўся ўладай. І нават пазачарговыя выбары — у нейкай ступені рэакцыя на Паўночную Афрыку. Эканамічна — гэта ўжо не той Казахстан, і людзі рэальна адчулі, што такое рост коштаў пры замарожаных заробках і адсутнасці працы.

***— На фоне якой эканамічнай сітуацыі адбыліся выбары?***

— У Казахстане, нягледзячы на ўсе аптымістычныя заявы, усё ідзе пад адкос. Грошай катастрафічна бракуе. Літаральна напярэдадні выбараў Назарбаеў лётаў у Кітай, дзе атрымаў чарговы крэдыт. Нібы пад гарантыю перадачы ў арэнду казахстанскай зямлі (што зусім не ўзрадавала нацыянал-патрыётаў). Зімовая Азіяда каштавала Казахстану 1,5 мільярда долараў… З-за поўнага развалу ацяпляльнай сістэмы змерзла пяць гарадоў... Казахстан «прадае» тое, што засталося ад савецкага часу, не пабудаваўшы ўзамен нічога. А грошай на аднаўленне няма. Але затое цяпер Назарбаеў агучыў свае прэтэнзіі на правядзенне зімовых алімпійскіх гульняў. Паабяцаў, што грошай на гэта не пашкадуе.

***— Ці падтрымлівае Назарбаева руская абшчына?***

— Цікава, што раней рускія арганізацыі дзвюма рукамі падтрымлівалі Нурсултана Назарбаева як гаранта больш-менш спакойнага становішча рускіх у Казахстане. Але не ў гэты раз. Цяпер меркаванні падзяліліся. Віной таму відавочныя рэверансы прэзідэнта нацыянал-патрыётам і абяцанні «навучыць» рускіх дзяржаўнай мове да 2020 года.

***— Падчас кампаніі Назарбаеў публічна «наехаў» на моду насіць паранджу. Гэта неяк змяніла яго адносіны з мусульманскай абшчынай?***

— Цяжка сказаць. Мусульманская абшчына, па вялікім рахунку, і раней вельмі прахалодна ставілася да Елбасы (Лідара нацыі), жывучы сваім жыццём. Аднак любові да яго гэта выказванне не дадало. Але не такая ўжо і вялікая мусульманская абшчына ў Казахстане.

***— Гэта апошні тэрмін Назарбаева, ці ён пойдзе яшчэ на адзін?***

— Вось толькі сёння ён заявіў, што гэта яшчэ не канец, і ён абавязкова высунецца ў 2018 годзе. Але, як нядаўна пісаў маскоўскі журналіст Дубноў, «у Казахстане людзі хадзілі выбіраць Назарбаева, як у апошні раз»… Можа, ён і мае рацыю.

ЦІКАВА

# НЕТРАДЫЦЫЙНЫ ГАНДЗІ

Алег НОВІКАЎ

**Архітэктар незалежнасці Індыі, заснавальнік руху грамадзянскага супраціву Махатма Гандзі, магчыма, быў бісэксуалам. Так сцвярджае Джозэф Лелівелд — аўтар новай біяграфіі Гандзі. Індуісцкі свет пратэстуе.**



Джозэф Лелівелд






Нягледзячы на тое, што Махатма Гандзі быў забіты больш за 60 гадоў таму, ён дасюль нябачна прысутнічае ў індыйскай палітыцы. Імя Гандзі, фрагменты ягонай біяграфіі і канцэпцыі ўвесь час згадваюцца ў ходзе палітычных дэбатаў. Пасля выхаду апошняй біяграфіі Гандзі рост яшчэ большага інтарэсу да яго спадчыны гарантаваны.

Кніга Джозэфа Лелівелда «Вялікая душа: Махатма Гандзі і ягоная барацьба ў Індыі» з'явілася ў крамах на мінулым тыдні.

Лелівелд (нарадзіўся ў 1937 годзе) больш за ўсё вядомы як выканаўчы рэдактар газеты «New York Times». Ён лаўрэат журналісцкай прэміі Пулітцэра і аўтар серыі кніг.

Апошняя яго кніга «Вялікая душа» даследуе маладыя гады Гандзі. Частку сваёй маладосці Гандзі правёў у Паўднёвай Афрыцы, дзе акрамя працы адвакатам атрымаў першыя азы палітычнай працы. Адсюль у 1914 годзе ён пераехаў у Індыю, дзе змяніў сваё імя Махандас на імя Махатма (Вялікая душа) і стаў прафесійным рэвалюцыянерам.

Акрамя ўсяго іншага, у фокус інтарэсу Лелівелда трапіла асабістае жыццё будучага палітыка. Пакапаўшыся ў мемуарах сучаснікаў, а таксама ў асабістай перапісцы Гандзі, аўтар падводзіць чытача да думкі, што той быў як мінімум бісэксуалам. Непасрэдна рабіць такія радыкальныя маніфесты Лелівелд дазволіў сабе пасля вывучэння адносін Махатмы і яго сябра, нямецкага архітэктара Германа Каленбаха. Разам яны два гады здымалі пакой. Праз нейкі час Махатма адправіўся ў Індыю, захаваўшы добрыя сувязі з сябрам. Яны працягвалі абменьвацца лістамі.

На думку аўтара, гэтыя сувязі былі больш чым проста сяброўскія. Галоўнай улікай з'яўляецца цытата з аднаго з лістоў, які Гандзі даслаў Герману. Гандзі пісаў: «Ты цалкам кантралюеш маё цела. Гэта татальнае рабства». Акрамя таго, як сцвярджае аўтар, у доме Гандзі партрэт Германа доўгі час стаяў на стале каля ложку. Нарэшце, у тэкстах згаданых лістоў Лелівелд знайшоў шмат метафар, якія маглі ўжывацца для таго, каб схаваць нейкі вядомы толькі перапісчыкам сакрэт ад чужакоў.

Наколькі верагодна версія Лелівелда? Пра інтымнае жыццё Махатмы сапраўды мала вядома. Паколькі ён паходзіў з традыцыйнай сям'і, яго ўжо ў 13 год ажанілі. Ад гэтага шлюбу нарадзілася 4 дзіцяці. Пазней Гандзі прытрымліваўся ідэі палавога ўстрымання. Цэлібат, дарэчы, як прызнаюць гісторыкі, у шмат чым дапамог Гандзі стварыць з сябе вобраз месіі.

Гісторыкі і біёграфы Гандзі сыходзяцца ў думцы пра тое, што тэзісы Лелівелда вельмі надуманыя. Захаваўся ліст, які Гандзі даслаў сваёй жонцы з турмы, дзе адбываў дзяжурны тэрмін. Тэкст ліста вельмі эмацыйны. Цяжка ўявіць, што яго пісаў аматар мужчынскага цела.

Аднак жоўтую прэсу ўжо, здаецца, нічым не пераканаць. Так, прысвечаная «Вялікай душы» рэцэнзія ў брытанскай «Daily Mail» называецца «Гандзі пакінуў жонку дзеля каханка».

Кніга, як і трэба было чакаць, адразу выклікала незадавальненне ў Індыі. Гэта дастаткова дзіўна, паколькі дасюль ніводнае кніжная сетка ў краіне не пачала яе рэалізацыю. Аднак немагчымасць азнаёміцца з творам Лелівелда не перашкаджае індускім нацыяналістам дзейнічаць у духу лозунга савецкіх часоў: «Мы Пастэрнака не чыталі, аднак асуджаем». На пасяджэнні парламенту штату Гуджарат (родны штат Гандзі) аднагалосна вырашана забараніць продаж кнігі на тэрыторыі штату. Падобныя рашэнні прынятыя ў іншых штатах. Заложнікам гісторыі вакол «Вялікай Душы» аказаліся мясцовыя гомасексуалісты, якія атрымалі легалізацыю ў Індыі толькі два гады таму. Ходзяць чуткі, што хутка іх чакаюць пагромы.

Сваё слова кажуць і родныя. Так, Тушар Гандзі, праўнук Махатмы, лічыць, што заходнія пісьменнікі займаюцца «бруднымі фальсіфікацыямі». На яго думку, Лелівелд скарыстаўся тым, што Гандзі і ягоныя прыхільнікі не прымаюць гвалту. «Паспрабаваў бы ён (Лелівелд) напісаць нешта падобнае пра мусульман. Ён спецыяльна абраў для сваіх правакацый Гандзі», — кажа Тушар.

Самае цікавае, што скандал наконт магчымай латэнтнай гомасэксуальнасці Гандзі зацьміў іншыя тэмы, узнятыя ў біяграфіі. Так, Лелівелд цытуе здзеклівыя заўвагі юнака Гандзі на адрас чарнаскурага насельніцтва Паўднёвай Афрыкі. Аднак праблема таго, што Гандзі мог быць расістам, чамусьці ў Індыі нікога не цікавіць.

А вось «New York Times» заклікае чытача не звяртаць увагу на пасаж пра нетрадыцыйную арыентацыю Махатмы. Сутнасць кнігі ў тым, як малады чалавек становіцца палітычным актывістам і сацыяльным рэфарматарам. Тое ж самае кажа сам Джозэф Лелівелд, звяртаючы ўвагу на тое, што ў ягонай кнізе ніводнага разу не ўжываецца слова «бісэксуальны» або «гомасэксуальны».

Між тым, некаторыя прыхільнікі гандызму лічаць, што скандал вакол «Вялікай Душы» памяці Гандзі толькі на руку. Гэта значыць, што мільёны людзей па ўсім свеце пазнаёмяцца з ідэямі пасіўнага грамадзянскага супраціву і мірнага дыялогу цывілізацый. Менавіта ідэі Гандзі зараз як ніколі запатрабаваныя чалавецтвам.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ПЁТР ЦЫБЕНКА



Дэпутат Вярхоўнай Рады Украіны ад партыі камуністаў выступіў з заканадаўчай ініцыятывай. Яе сутнасць — замацаваць за чырвоным сцягам статус Сцяга перамогі. Гэта значаць, што 9 мая на кожным адміністратыўным будынку краіны будзе лунаць сцяг СССР. А паколькі зараз ідзе сесія, цалкам магчыма, што закон уступіць у сілу ўжо на днях. Раней падобныя рашэнні былі прынятыя ў Севастопалі, Адэсе і Жытоміры. Відавочна, што праект Цыбенкі выклікаў новую фазу супрацьстаяння Захаду і Усходу Украіны. Раней Львоўскі аблсавет вырашыў увогуле не святкаваць у рэгіёне 9 мая. 5 красавіка была прынятая новая рэзалюцыя, адпаведна якой «ініцыятывы наконт сцягу з'яўляюцца змовай былых савецкіх бюракратаў, якія, маскіруючыся пад украінскіх дэпутатаў і службоўцаў, у інтарэсах Расіі робяць усё для вяртання таталітарных знакаў у сучасную Украіну». Дасталася і міністру культуры і адукацыі Дзмітрыю Табачніку, які вярнуў у падручнікі тэрмін «Вялікая Айчынная вайна». Усё гэта кажа, што 9 мая пройдзе ва Украіне вельмі напружана.

### ФІЛІП РОСЛЕР



Міністр аховы здароўя ФРГ, этнічны в'етнамец Рослер лічыцца галоўным фаварытам на пасаду старшыні Партыі свабодных дэмакратаў (FDP). Пасада старшыні стала вакантнай пасля таго, як 3 красавіка цяперашні лідар партыі Гіда Вестэрвеле заявіў пра тое, што сыходзіць у адстаўку. Праўда, ён хацеў бы далей кіраваць замежным ведамствам ФРГ. Адстаўку Гіда звязваюць з серыяй правалаў лібералаў на трох апошніх рэгіянальных выбарах. Толькі ў адной з трох земляў FDP здолела трапіць у мясцовы парламент. Гэта пры тым, што два гады таму партыя атрымала рэкордную колькасць галасоў у сваёй гісторыі — 14 працэнтаў. Рослер нарадзіўся на поўдні В'етнама і трапіў у Германію ва ўзросце 9-ці месяцаў — яго адаптавала нямецкая сям'я. Пазней зрабіў кар'еру вайсковага медыка. Адначасова праявіў сябе як заўзяты каталік — ён сябра кіраўніцтва аб'яднання нямецкіх каталікоў. Цікавіўся хлопец і палітыкай. Яму ўдалося ўвайсці ў кіраўніцтва FDP. Пасля таго, як партыя ўвайшла ў склад ураду, Рослер атрымаў партфель міністра аховы здароўя. Філіп, аднак, не святы. Яго абвінавачваюць у лабіраванні інтарэсаў фармацэўтычных кампаній. Лічыцца, што фармальна Рослер стане лідэрам лібералаў на майскіх партыйных зборах.

### АЛЯКСАНДР СУРЫНАЎ

Кіраўнік расійскай федэральнай службы дзяржаўнай статыстыкі (Росстат) стаў галоўным ворагам рускіх шавіністаў, бо заявіў, што гатовы прызнаць нацыю «сібіракі». Па яго словах, падчас перапісу насельніцтва шэраг рэспандэнтаў прылічылі сябе да «сібіракоў», запаўняючы графу пра нацыянальнасць. «Значыць, будзем сібіракоў вылучаць у асобны этнас. Людзі са славянскімі і цюркскімі прозвішчамі жаліліся, што іх як сібіракоў крыўдзяць», — сказаў кіраўнік Росстата. На Сурынава адразу накінуліся ўсе прыхільнікі адзінай рускай нацыі. Так, вядомы праваслаўны нацыяналіст Кірыла Фралоў напісаў наступнае: «Ніякай нацыянальнасці «сібірак» не было. Няма і быць не можа! Пазіцыя часткі Дзяржкамстата шакуе. Такі чалавек не можа заставацца на дзяржаўнай службе, калі мы хочам захаваць Расію. У Сібіры жывуць рускія. Пакуль не позна, гадасць і дыверсію наконт «сібірскай нацыі» неабходна спыніць, вылічыць і яе замоўцаў, і выканаўцаў, накіраваных на рассячэнне і знішчэнне Расіі». Варта нагадаць, што напярэдадні перапісу насельніцтва ў Сібіры прайшла кампанія за права называцца «сібіракамі», супраць якой выступілі патрыёты-дзяржаўнікі. Дарэчы, акрамя сібіракоў шмат людзей запісаліся «эльфамі». Іх, па словах Сурынава, таксама будуць выдзяляць у асобны этнас. А вось супраць нацыі эльфаў патрыёты нічога не маюць.



ВАНДРОЎКА

# ВАВЁРКІ АМЕРЫКІ

## З КІМ НАЙЛЕПЕЙ СУСЕДЗІЦЬ, ЖЫВУЧЫ Ў ЗЛУЧАНЫХ ШТАТАХ

Марыя МАРТЫСЕВІЧ

**Паўночныя штаты ЗША мала чым адрозніваюцца, калі глядзець вачыма турыста. Гарады, на першы погляд, падобныя адзін да аднаго. Але ёсць прыкмета, па якой ужо на другі месяц беспамылкова вучышся вызначаць, куды цябе занесла. Гэта колер вавёрак у тым ці іншым штаце. Вавёркі ў Амерыцы паўсюль. Яны тут свае, як у Еўропе — галубы. Шматлікай папуляцыі пушыстахвостых таварышуюць трусы, бурундукі і — зрэдчас — скунсы. У маім «родным» штаце Аява вавёркі дробныя і шэра-срабрыстыя. А вось у Мічыгане, які адносна побач (сем гадзінаў машынай) — вавёркі памерам з гадавалую котку і рудыя. А ёсць штаты, дзе вавёркі бурыя ці чорныя. Амерыканскія вавёркі маюць волю выбіраць, дзе ім жыць, але падобныя трымаюцца побач. Здаецца, гэта называецца арэалам.**



Чорнае гета Балтымара — адна з самых крымінагенных кропак ЗША



Рудая вавёрка, якая жыве на тэрыторыі Мічыганскага ўніверсітэта

Людзі — тыя ж вавёркі: падобныя імкнуцца жыць побач. І гаворка тут не толькі пра колер скуры, хаця і пра яго таксама. Калі назіранне за амерыканскімі вавёркамі — гэта хутчэй наіўная заалогія і нейкія пазітыўныя эмоцыі ад судакранання з жывёльным светам, то назіранне за самімі амерыканцамі — гэта прыкладная антрапалогія, спроба разабрацца, хто і дзе, і, галоўнае, а з кім ты на гэтай стракатай мапе нацыяў, расаў, моваў і гадавых прыбыткаў. З кім жыць, калі жыць у Амерыцы? Гаворка найперш пра вялікі горад.

### Чорнае гета Балтымара

Гэта была адна з самых небяспечных экскурсій у маім жыцці. У афраамерыканскае гета Балтымара мы паехалі на машыне, але ўсё адно знаёмыя трактавалі наш учынак як самазабойчы: «Вы вар'яты! Ну чаму «навічкі» лічаць сябе героямі, упарта лезучы на ражон? А калі б машына заглухла???» Але Дзіма сказаў, што кантралюе сітуацыю: ён ведае вуліцы, па якіх, паводле мясцовых паняццяў, у светлы час сутак белым дазваляецца ездзіць на машынах. Бо ёсць яшчэ вуліцы, дзе адзіныя легітымныя (хоць і непажаданыя) госці неафрыканскага выгляду — гэта камунальнікі, пажарныя і дактары «хуткай».

Мы едзем па занядбаных вуліцах, я спрабую рабіць здымкі, людзі на вуліцах нешта крычаць нам услед, а Дзіма перакладае: «Той дзед на ганку назваў цябе белай шлёндрай... А вунь тая дзяўчына папрасіла схаваць камеру, інакш яна выцягне пушку і вышыбе табе мазгі». Пераклад мне неабходны, бо крычаць зусім не па-англійску ці там па-амерыканску, а на эбаніксе — мове чорнага насельніцтва ЗША. Дзіма і яго аднагодкі з былога СССР хадзілі ў школу з дзецьмі чорнага гета і гэтую мову разумеюць выдатна. Кажуць, былі нават сацыяльныя праграмы па пераводзе пачатковай школы ў чорных раёнах з англійскай на эбанікс, бо галоўнае — веды, а літаратурны варыянт амерыканшчыны дзеткі з чорных кварталаў банальна не разумеюць.

Каб сябра ці сваяка выпусцілі з турмы пад заклад, у ЗША трэба заплаціць каля 700 долараў. Гэта можна зрабіць праз спецыяльны аўтамат. У ваколіцах Друід-парку — сэрцы чорнага гета — такіх аўтаматаў больш, чым банкаматаў. Мы акурат едзем па шашы, якая перасякае парк: на адхонах гэтай шашы мінімум раз на тыдзень паліцэйскія знаходзяць труп.

Чорныя гета — самая нявырашаная сацыяльная праблема Амерыкі. Афраамерыканцы складаюць 13% насельніцтва ЗША, але на іх долю прыходзіцца 40% усіх цяжкіх злачынстваў. І іншых бядотаў, рэха тых расавых уціскаў, якія чарнаскурыя ў ЗША зазналі да 1960-х. Тут сплялося ўсё: беспрацоўе і непісьменнасць, алкагалізм і наркотыкі, прастытуцыя і мафія. Гэта выглядае нават паэтычна, пакуль ты глядзіш паліцэйскія серыялы. Калі ж табе да спіны прыцісакаюць рулю пісталета і просяць здаць грошы і крэдыткі, робіцца не да смеху. Знаёмая нямецкая студэнтка з Чыкага, якой даводзіцца наймаць жытло ў такім суседстве, выходзіць з метро, трымаючы ў адной руцэ ключы ад дому, а ў іншай — тэлефон, на якім набраны нумар 911.

Але чорныя гета — не трушчобы. Бо архітэктура трушчобаў — выпадковая і хаатычная, а чорныя гета зазвычай хаваюцца ў цэнтры гораду, пераважна — гістарычным. Мы едзем па калісьці фешэнебельных вуліцах Балтымара. Усё гэта — каштоўны жылы фонд, на выгляд — канца XIX — пачатку XX стагоддзя. Яго жыхары займаюць добра спланаваныя прыгожыя трохпавярховыя будынкі, якія стаяць у радок, шчыльна адзін да аднаго. Раней тут жыў сярэдні ці нават вышэйшы клас. Потым адбыліся розныя змены, у выніку якіх заможныя людзі перасяліліся за горад, а дамы ў цэнтры сталі таннымі. У пачатку XX стагоддзя сюды прыйшлі эмігранты з Еўропы, напрыканцы XX стагоддзя іх замянілі бедныя чорныя, якія акурат перасяляліся з Поўдня на Поўнач у пошуках працы. Некаторыя з будынкаў цяпер згарэлі і тырчаць на сківіцы вуліцы як зубы, з'едзеныя карыесам.

Сэнс такіх экстрэмальных паездак па небагатай на старасветчыну Амерыцы яшчэ і ў тым, каб пабачыць архітэктурную спадчыну, што цалкам верагодна можа стаць страчанай — калі толькі чорнае гета не зазнае джэнтрыфікацыі.

### Норссайд і яго абывацелі

Джэнтрыфікацыя — гэта калі больш заможная частка гарадскога насельніцтва перабіраецца ў бяднейшыя кварталы, бо там таннейшае жытло. Адбываецца зазвычай у два этапы. Спачатку ў небяспечныя раёны пераязджае творчая багема: мастакі, літаратары, маладыя журналісты, студэнты — людзі з высокім культурным капіталам, але худым гаманцом. З часам яны авысакароджваюць раён — не толькі падфарбоўваюць фасады, але яшчэ і робяць яму рэкламу ў сваіх карцінах, паэзіі, кіно, артыкулах, сацыяльных сетках. Адпаведна, сяліцца ў тым ці іншым месцы стаецца модным. Кошты на жытло вырастаюць — і суседзямі мастакоў робіцца гарадскі сярэдні клас — найперш прагрэсіўных поглядаў, а потым падцягваюцца тыя, хто любіць, каб было, як ва ўсіх. «Калі будзеш заставацца ў Чыкага (Пітсбургу, Вашынгтоне, Сан-Францыска) — вучаць мяне ў кожны амерыканскім горадзе, куды мяне заносіць логіка паездкі, — прыкмячай, куды пераязджаюць геі. Геі — санітары гораду. У іх няма дзяцей, і таму яны выдаткоўваюць багата высілкаў на жытло і атмасферу ў сваім раёне».

У гарадах ЗША джэнтрыфікацыя азначае, што чарнаскурыя сыходзяць, і ў квартал прыходзіць белае насельніцтва. Гэтак адбылося ў апошнія гады ў Норссайдзе — пітсбургскім квартале XVIII стагоддзя, у якім яшчэ да першай сусветнай жылі заможныя ўладальнікі сталяварнага бізнэсу. Ужо ў 1930-я раён апусцеў, бо металургія Пітсбурга збанкрутавала. Спачатку раён засялілі эмігранты з Усходняй Еўропы, а потым тут стала чорна. «Яшчэ пяць гадоў таму на гэтых вуліцах штодня адбывалася злачынства. Цяпер раён стаў значна спакайнейшым!» — расказвае актывістка Норссайду Даяна на экскурсіі, да якой я далучаюся. Калі ў іншых гарадах і краінах пераезд мастакоў у танную частку гораду — з'ява стыхійная, то багема Пітсбургу вядзе свядомае змаганне за Норссайд. Менавіта дзеля архітэктуры: будзе шкада, калі ўнікальныя жылыя будынкі векам у тры стагоддзі занепадуць.

Генры Рыс — кіраўнік культурніцкага фонду, які займае цэлую вуліцу Норссайду і прылеглыя да яе завулкі. Вуліца называецца Самсонія Вэй, і мне яна цікавая найперш як адзін з самых вядомых у свеце літаратурных кварталаў. Дамы тут распісаныя літарамі розных алфавітаў — гэта ўрыўкі з твораў пісьменнікаў з Кітаю і Бірмы, якія ў свой час жылі тут. Каб прыцягнуць увагу да раёну, Генры і яго паплечнікі штогод ладзяць паэтычна-джазавы фэст, які збірае на вуліцах кварталу тысячы аматараў музыкі. Людзі прыходзяць на бясплатны канцэрт, але ахвотна падпісваюць чэкі, ахвяруючы на развіццё літаратурнай калоніі.

Цікава, што актывісты Норссайду не маюць на мэце выцясняць беднае чарнаскурае насельніцтва. За апошнія пяць гадоў найбольш небяспечныя насельнікі Норссайду і так уцяклі «туды, на гару». З іншымі карэннымі жыхарамі актывісты спрабуюць працаваць. Напярэдадні джазавага фэсту тут зладзілі «літаратурную сцяжынку». Людзям расказваюць пра гісторыю кварталу, пра тое, як важна дагледзець дамы, чаму нічога нельга разбураць. Генры выкупіў яшчэ тры будынкі на сваёй вуліцы і збіраецца перарабляць іх на вялікі цэнтр культуры. Пра гэта таксама расказваюць чарнаскурым суседзям, якія з цікаўнасцю падыходзяць паслухаць экскурсію. У мініяцюрных падворках вуліцы Самсонія Вэй расстаўленыя крэслы — калі зайсці ў адзін такі і крыху пачакаць, з дому выходзіць паэт і пачынае чытаць вершы.

Але, здаецца, гэта высакароднае намаганне будзе марным, калі кошт жытла ў Норссайдзе працягне павялічвацца. З іншага боку, новым насельнікам важна захаваць у адным месцы мінулае і сучаснасць — фешэнебельнае шкло дарагіх рамонтаў таксама не для іх. Старыя фасады рэстаўруюць або фарбуюць у вясёлыя колеры, паліcаднікі напаўняюць кветкамі, а прастору паміж двума дамамі на адной з вуліцаў нехта засадзіў гародчыкам, дзе расце, зразумела, экалагічна чыстая гародніна.

У Норссайдзе я жыву ў Дэвіда і Беліндэ — пажылой бяздзетнай пары, якая адна займае трохпавярховы будынак. Займаю цэлы паверх: свая гасцёўня, свая спальня, свая ванная і свая котка. Усяго ў доме котак восем. Апроч коткі (а, зрэшты, і з ёй таксама) — прадстаўлены мне «хатні набор» паводле сваіх параметраў сувымерны са стандартнай савецкай хрушчоўкай — толькі столі вышэйшыя. Старэйшыя за мяне людзі паўжартам кажуць, што ідэю супольнага санвузла дзеля эканоміі прасторы Хрушчоў прывёз з ЗША. Забыўшы, праўда, удакладніць забудоўшчыкам: адзін аб'яднаны санвузел «у буржуяў» прыходзіцца на аднаго чалавека... Гаспадары нават не зазіраюць для мяне — ім завысока ўзлазіць на трэці паверх. Я сама спускаюся на іх тэрыторыю, каб пагутарыць пра котак і Норссайд.

Дэвід і Белінда — праграмісты ў вялікіх карпарацыях, некалькі год таму яны пераехалі сюды, бо тут віруе культурнае жыццё, і ў іх цікавыя суседзі. У іх доме шмат антыкварыяту, які добра гармануе з мармуровымі балюстрадамі і рыпучымі драўлянымі сходамі. Гэта таксама частка стылю, які прыняты ў адроджаным Норссайдзе. Нічога новага.

Ёсць у медаля джэнтрыфікацыі і адваротны бок. Адзін з маіх новых таварышаў у ЗША — пісьменнік Джэйсан Інгланд. Ён нарадзіўся і вырас у Нью-Ёрку на Манхэтане, у Гарлеме — сусветна вядомым афраамерыканскім квартале, калысцы хіп-хопу. Джэйсан з сумам расказвае пра родны раён — ён не можа дазволіць сабе кватэру там, бо за апошнія дзесяць гадоў кошты на жытло ўзляцелі да нябёсаў. У раёне ўсё больш белага і мексіканскага насельніцтва — чорныя, якія зрабілі Гарлем такім, які ён ёсць, сыходзяць.

Перайначваючы вядомую прымаўку, можна вывесці чарнаскурага з гета, але нельга вывесці гета з чарнаскурага. І гэта па-свойму выдатна. Найлепшыя амерыканцы, якіх я сустрэла ў ЗША, былі мурыны — джаз-музыкі, запрошаныя на фэст у Норссайдзе. Эліта сваёй прафесіі, яны спрэс жывуць на Манхэтане ў Нью-Ёрку. Яны ёсць людзьмі надзвычай адоранымі, выдатна адукаванымі, і ў той жа час хлопцы захавалі аўтэнтычны драйв, разняволенасць і свабоду, якую дае вуліца. З адным з іх я гадзіну гутарыла пра нюансы беларускага абраду Купалля — падчас джазавага фэсту я чытала прысвечаны Купаллю верш, і саксафаністу было вельмі важна ведаць, якім менавіта словам і сэнсам ён акампануе.

Жывучы ў ЗША, я б пераехала джэнтрыфікаваць чорнае гета. Але, зразумела, толькі ў выпадку, калі б адпусціла мама.

ВЕРСІЯ

# МІХАЛЕВІЧ ПАДМАНВАЕ ГЭБОЎЦАЎ

## САЧЫЦЕ ЗА ЖЭСТАМІ

Андрэй РАСІНСКІ

**Генеральная пракуратура Беларусі на прэс-канферэнцыі 4 красавіка прадэманстравала відэанарэзку пра Алеся Міхалевіча, знятую ў СІЗА КДБ схаванай камерай. Фільм, неахайна складзены з кавалкаў розных допытаў, мусіў даказаць, што кандыдат у прэзідэнты Алесь Міхалевіч добраахвотна згадзіўся супрацоўнічаць з рэпрэсіўнай машынай, а ў ізалятары яго ніхто не катаваў.**







У кадрах Міхалевіч налівае гарбату аператыўнаму супрацоўніку і кажа пра лаяльнасць да ўлады. Але ягоныя жэсты сведчаць пра адваротнае. Міхалевіч падманвае гэбоўцаў і ледзьве не ў адкрытую з іх кпіць.

Калі гэбовец сцвярджае: «Ёсць свае плюсы знаходжання ў Амерыканцы», Міхалевіч, вернуты ў ГБ з Валадарскай турмы, ухілiста згаджаецца: «У кожным выбары ёсць свае плюсы». Пры гэтым ён засланяе рот рукою. Такі жэст азначае нязгоду ці проста хлусню. Адпаведна, і наступныя — «заслоненыя» — фразы Міхалевіча пра «просты і вясёлы народ» таксама не сведчаць пра камфорт, хаця сказаныя яны з падкрэсленай бадзёрасцю.

Пасля лірычных разважанняў пра сняданкі і вячэры ў гэбоўскай турме, Міхалевіч гаворыць пра сваю законапаслухмянасць. Міхалевіч сядзіць у крэсле, адна рука на стале; цела часткова павернутая да суразмоўцы. Але ў цэлым, гэты жэст адкрыты: сапраўды, Міхалевіч — чалавек законапаслухмяны, сваю кампанію ён вёў без усялякіх радыкальных заклікаў, як і сцвярджаецца ў фразе.

Жэст Міхалевіча з наступнага мантажнага кавалку — ужо замкнёны. Кандыдат у прэзідэнты — на тым жа самым месцы, але абедзве рукі на стале, Міхалевіч праводзіць пальцамі па паверхні, кідае ўхілісты позірк долу. Пры гэтым Міхалевіч падкрэслена тэатральна кажа, што гатовы размаўляць па канкрэтных пытаннях і пра канкрэтных людзей, кажа пра ўласную адкрытасць і згоду дапамагчы, калі трэба.

А жэсты замыкаюцца ўсё болей — і ўжо цалкам супярэчаць ягоным словам. Словы пра адкрытасць — і рукі складзеныя разам, амаль счэпленыя ў ахоўны замок; стол ледзве маскуе абарончы жэст дый сам выступае заслонай ад ворага.

— Калі мяне вызваляць, для сустрэч я адкрыты! — абяцанка-цацанка, а дурню радасць.

— Вы абяцаеце выпіць са мной філіжанку моцнае кавы ці чаго мацней, — купляецца падмануты аператыўнік.

— Я запрашу вас на кальян за свае грошы!

— Вы ж ведаеце, я кінуў паліць, — здзіўлены такой ветлівасцю гэбовец, які так і не ўцяміў, што з яго ўжо тонка здзекуюцца.

— Добра, я буду паліць, калі вы не супраць займацца пасіўным паленнем (!), а вы вып'еце моцнай кавы ці гарбаты, — ідзе ў наступ Міхалевіч.

У мантажнай зрэзцы здзек працягваецца:

— Я ўпэўнены, што вы патрэбны, — залагоджвае Міхалевіч гэбоўца, — упэўнены, што ваша служба «и опасна, и трудна».

Іранічная цытата — пазычаная з папулярнае расійскае кінапесні — гэтую «ўпэўненасць» цалкам касуе. Але гэбовец і блізка не заўважае, што гэта кплівая цытата:

— Тым і небяспечная, што складаная! — нават адмыслова зменены голас раздзімаецца ад уласнае пыхі.

Міхалевіч усміхаецца: нажыўка праглочаная. Гульня працягваецца: «Упэўнены, у нечым патэнцыяльна магу быць карысным», — ізноў вочы долу, рукі на стале, ізноў падман — і нат без канкрэтыкі.

«Я згодны дапамагаць, сітуацыя змяніліся, тое, што вы робіце, ідзе на карысць нацыянальным інтарэсам Беларусі», — наколькі можна зразумець з відэа, перакрытага тоўстай спінай супрацоўніка, у Міхалевіча нават рукі счэпленыя на грудзі (максімальная ахова і абарона). — Так што якая дапамога, якія «нацыянальныя інтарэсы Беларусі» гэбоўскага ведамства!?

І, нарэшце, каронная: «Можаце разлічваць. Я чалавек, які пакуль нікога не кідаў і не падманваў», — Міхалевіч не проста апусціў вочы, але круціць у пальцах нейкую драбязу, — гэта візуальна ўвасобленыя падман і разводка. Вось так і «вакол пальца і абводзяць». А фразы з іншай мантажнай зрэзкі пра спыненне палітычнае дзейнасці, сказаныя падкрэслена гучна, выглядаюць завяршэннем падману.

У апошніх кадрах самотны Міхалевіч нервова смяецца і напявае шансон «Уладзімірскі цэнтрал». Лукашэнкаўскае агенцтва «Інтэрфакс» растлумачыла, што «пасля сыходу следчага з пакою… Міхалевіч выглядаў надзвычай задаволеным сабой і нават нешта маляваў пальцам на сцяне».

Але сам Міхалевіч распавёў, што следчы ў гэты час знаходзіўся ў пакоі, і казаць пра нейкую ненадзорнасць не даводзілася. Міхалевіч цярпець не можа шансон і нават у сваіх перадвыбарчых выступах прапаноўваў яго забараніць. Спеў ненавіснага шансону — апошняя здзеклівая цытата, чарговы абарончы жэст ва ўмовах гэбоўскае катавальні.

Па вызваленні з турмы КДБ Міхалевіч распавёў пра катаванні ў ізалятары — і што ён падпісаў дамову аб супрацоўніцтве, каб з турмы выйсці і пра здзекі ў адкрытую абвясціць. Міхалевіч адразу разарваў пагадненне з ГБ — і даслаў запыты ў пракуратуру. Заявы Міхалевіча сталіся ўдарам для ведамства Дзяржынскага.

Наступным ударам сталася тое, што паднадзорны Міхалевіч з Беларусі ўцёк. Цяпер ён у Чэхіі і можа выступіць ключавым сведкам на лонданскім працэсе аб катаваннях у Беларусі, што пагражае Лукашэнку стратай дыпламатычнага імунітэту.

Відэа, прадэманстраванае генеральнай пракуратурай (Міхалевіч казаў, што з'явіцца «фільм» пра яго), — мусіць даказаць, што ніякіх здзекаў у ізалятары КДБ няма. Але лукашэнкаўскія ўлады выставілі сябе на чарговую ганьбу: яны не толькі прызналіся, што з дапамогай карніцкай службы вярбуюць кандыдатаў у прэзідэнты, але і распісаліся ў тым, што гэтая служба села ў глыбокую лужыну.

КІНО

# ПРЫНЦЭСА Ў КРАІНЕ ЗАЧАРАВАНЫХ ЛЮСТЭРКАЎ

Андрэй РАСІНСКІ

**У беларускіх кінаэкранах — новая казка. Алена Турава распавяла гісторыю пра люстэркі, злых прынцаў і смелую прынцэсу ў зачараванай краіне.**





«Рыжык у Залюстроўі» грае з цудоўнай Алісаю, што з краіны цудаў, спасылаецца на Гары Потэра і вяртае кінастудыі забыты гонар.

Галоўная гераіня стужкі — рудавалосая гарэзлівая дзяўчынка Вераніка. З Мінску яна трапляе ў краіну Нядалію, дзе калісьці была прынцэсай. У Нядаліі злы прынц Морціс зачараваў усе люстэркі — і людзі, паглядзеўшы ў іх, становяцца ценямі. Толькі каралеўская асоба — а ёй і з'яўляецца гераіня — можа скасаваць злы праклён і выратаваць Нядалію. Але чорныя сілы ўжо пратачваюцца ў наш свет.

Алена Турава — дачка беларускага класіка Віктара Турава, які праславіўся лірычнымі фільмамі пра вайну і экранізацыяй «Людзей на балоце». Але ў адрозненні ад свайго бацькі-рэаліста, Алена Турава захапляецца фантазійнымі светамі. Яе «Навагоднія прыгоды ў ліпені», хаця і мелі недасканалы сюжэт, здзіўлялі нетутэйшай вогненнай жанчынай, фіялетавымі грыбамі і іншапланетнымі раслінамі, што граюць у футбол.

У «Рыжыку» адмысловых эфектаў паболела, сюжэт узмацніўся (хаця і ёсць што паляпшаць). На экране — дзівосы, цуды, прыгоды. Пясочны чалавек, складзены з драбінак, цягнецца да вады. Драпежна-бэзавая расліна з паралельнай прасторы аплятае пакоі, зубастыя чэрві-шаўкапрады пагражаюць непрыемнасцямі. І ляцяць чароўны буслік з выратаваным немаўлём. Іголка стаецца падземнай прынцэсай, аграмадная жаба з'яўляецца з ніадкуль, а гном — Алег Гарбуз — прапаноўвае гарэх, што выконвае жаданні.

У фільме ёсць бойкі чараўнікоў, зубастыя кажаны, з якімі змагаецца шмараканскі кароль, і калматы руды шарык з хвосцікам, гарэза і жартаўнік, любоўна зроблены на кампутары.

Галоўная гераіня — Дыяна Запрудская — ужо звярнула на сябе ўвагу ў карціне Аляксандра Колбышава «Ваўкі», дзе яна грала шапялявую дзяўчынку. Цяпер у Дыяны Запрудскай — галоўная роля. Яна зухавата катаецца на роліках — па мінскіх вуліцах і каралеўскіх палацах, смяецца з прыдуманымі персанажамі і спрачаецца са злым ведзьмаком. Дзмітры Мілер — менавіта такі вядзьмак. У фільме Мілер грае добрага прынца Себасцьяна і ягонага злога брата. Папярэдняя стужка Мілера — «Масакра», дзе ён дзяліў сваю ролю з мядзведзем. Цяпер двайстасць персоны сталася дзвюма асобнымі ролямі. Адна роля — чыстая, светлая і музычная. Другая — злая, пыхлівая, па-свойму тонкая і няшчасная. У расійскага акцёра, які стаў сваім на «Беларусьфільме», вельмі добра атрымліваюцца казачныя персанажы.

А вось Павал Харланчук сыграў адразу тры ролі. Адна роля — двайная: бібліятэкар Генадзь Іванавіч — гэта галоўны маг Нядаліі (у абодвух увасабленнях Харланчук аднолькава пераканаўчы). А вось ігранага шмараканскага караля — не пазнаць. Акцёр прыдумаў для яго сваю мову, жэсты, характар; Харланчук цалкам пераўвасабляецца, мяняе аблічча — і ад душы пацяшаецца над сваім бутафорскім персанажам.

Залатыя валасы недалійскае каралевы, бела-крэмавыя шаты пакаёвак, цёмна-зялёныя пячоры — у фільме дасканалая і чароўная каляровая гама. А апусцелая краіна Нядалія (значыць, яна недалёка!) — нечакана рыфмуецца са стэрыльным Мінскам. Мінская школьніца сутыкаецца з зачараванымі люстэркамі, з двайнікамі і адбіткамі, з бясплотнымі ценямі, што былі людзьмі.

Як і гераіня, наша краіна завісла паміж сусветамі. Балаганная сцэна, калі пад партрэтам Пушкіна, шмараканскі кароль, ні з пушчы ні з поля, але навязліва прапануе маці Веранікі руку і сэрца — гэта вельмі па-беларуску. Гэтым грашыў яшчэ адзін уладар — злы герцаг беларускага «Гораду майстроў», дзе таксама была Вераніка — і дзе быў добры двайнік, які і перамог зло.

Многія кадры Алены Туравай выклікаюць непадробную радасць і зачараванне, нешта не так дасканала і прадумана. Але самы вялікі недахоп стужкі — гэта яе пракат.

Сапраўдны дзівосны цуд, які толькі-толькі з'явіўся, амаль не паказваюць. Але пабачыць яго ўсё ж такі можна.

ПОСТАЦЬ

# СТО ПЕРШЫ ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ

Генадзь КЕСНЕР

**6 красавіка споўніўся 101 год, бадай, самаму вядомаму беларусу свету, даследчыку, навукоўцу — Барысу Кіту.**



Я патэлефанаваў Барысу Уладзіміравічу, каб павіншаваць з народзінамі. Голас Кіта — бадзёры і жвавы, ніколі не скажаш, што гэтаму чалавеку ўжо 101 (!) год. Летась, напярэдадні стогадовага юбілею, мне пашчасціла пабываць у гасцях у Барыса Уладзіміравіча ў Франкфурце. Яшчэ тады мяне здзівіла і нават уразіла, наколькі светлы розум у гэтага чалавека і якая моцная станоўчая энергетыка ідзе ад гэтага волата! Прайшоў год, і, як мне падалося з тэлефоннай размовы, за гэты час Барыс Кіт зусім не змяніўся.

Той жа вясёлы смех, тыя ж жарты з уласнага ўзросту.

— Уяві сабе, вось сёння я скончыў сто першы год жыцця і пачаў сто другі. У Нямеччыне ўсяго дзесяць тысяч чалавек на восемдзесят мільёнаў, хто пераступіў сто год, гэта адна сотая працэнта! Мяне ўжо з гэтым многа павіншавалі, і нават сам прэзідэнт Германіі. Я па старому стылю нарадзіўся 24 сакавіка, а па новаму стылю — сёння. Так што некалькі разоў віншавалі. Многа гасцей сёння не будзе, але некаторыя самыя блізкія сябры прыйдуць. Мая сям'я з Амерыкі гэтым разам не прыедзе, яны летась прыязджалі на маё стагоддзе, але віншаванні і прывітанні яны мне ўжо даслалі.

Барыс Кіт падзякаваў за вялікае інтэрв'ю з ім, надрукаванае на старонках некалькіх нумароў «Новага часу» ў красавіку 2010 года, якое было прымеркавана да яго стогадовага юбілею (я дасылаў яму па поште нумары газеты).

«Дзякуй, я ўсё атрымаў, інтэрв'ю вельмі добрае атрымалася, «Новы час» — цудоўная газета! — пахваліў Барыс Уладзіміравіч, і гэтая пахвала дарагога каштуе. — Жадаю і табе, і чытачам усяго самага-самага найлепшага і поспехаў ва ўсім! Бывайце здаровыя!»

Здароўя Вам, Барыс Уладзіміравіч, бадзёрасці, сіл і доўгіх гадоў жыцця!


АБ'ЯВА

28 красавіка КЛУБ РЭАКТАР

**ВЯЛІКІ КАНЦЭРТ! ПРЭМ'ЕРА НОВЫХ ПЕСЕНЬ!**

**B:N: ПРЫ ЎДЗЕЛЕ ГУРТА «СПРАТ»**

**Пачатак** у 19.00. **Кошт квіткоў:** 20 000 — першыя 100, 25 000 — астатнія папярэдне, 35 000 — месца за столікам. **Кропкі продажу:** клуб Рэактар, пераход Коласа, ГУМ, Кастрычніцкая, ГЦ Купалаўскі, 19 кропка. ГЦ Рыга, 18 кропка і інш. **Даведкі:** 649 08 88.





ПРЭЗЕНТАЦЫІ

# «ROCK ON-LINE» МАРТЫНЕНКІ: «ВЗДРОГНУТ ФСЕ!»

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**Калі прыхільнікі творчасці Вітаўта Мартыненкі прыйшлі на заяўленае месца правядзення прэзентацыі новай кнігі гэтага вядомага музычнага крытыка — у сядзібу БНФ, то першае ўражанне ў іх было такое, што мерапрыемства пад пагрозай зрыву. Пастаянныя жыхары сядзібы, здаецца, «сядзелі на валізах» і рыхтаваліся пакінуць звыклае памяшканне, якое стала вядомым многім беларусам як сапраўдны нацыянальны палітычны і культурны цэнтр.**




Але гэта было ўяўнае ўражанне, ды і гаспадары сядзібы не выказвалі асаблівага хвалявання, бо рыхтаваліся да адстойвання сваіх правоў на арэндаванае памяшканне. Таму прэзентацыя новай кнігі Вітаўта Мартыненкі пачалася, як толькі месцы ў галоўнай зале былі запоўнены чытачамі. Сапраўды, гэтым разам тут адбывалася нетрывіяльная падзея — прадстаўленне чытачам новага музычнага бестселера ад В. Мартыненкі — яго кнігі «ROCK on-line».

Трэба адзначыць, што і папярэднія кнігі Вітаўта, створаныя сумесна з аўтарам гэтых радкоў — «Праз рок-прызму» (БІНІМ, 1989 г.) і «222 альбомы беларускага року і не толькі...» («Медысонт», 2006 г.), — былі прысвечаны шляхам развіцця беларускай папулярнай музыкі розных кірункаў і стылістычных адгалінаванняў. Але за гэтымі музычнымі акалічнасцямі аўтары ніколі не забывалі таго факта, што стварэнне паўнавартаснай беларускай масавай культуры не магчыма без выкарыстання роднага слова.

Па-сутнасці, новая кніга Мартыненкі — квінтэсенцыя гэтага пастулату, а таксама ўнікальны вопыт абароны роднага слова ад шматлікіх носьбітаў імперскай ідэалогіі, якія ў розныя часы вылучалі і навязвалі слухачам лозунгі, што прыніжалі магчымасці беларускай мовы ў актуальных кірунках сучаснага музычнага мастацтва. Успомнім, як на пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя яны паўсюдна даводзілі: «Гітара і ваша «калгасная мова» — несумяшчальная ад прыроды». Альбо сённяшнюю мадыфікацыю гэтага «лозунга»: «Якая розніца, на якой мове спяваць, галоўнае — музыка!»

Унікальнасць кнігі В. Мартыненкі «ROCK on-line» у тым, што аўтар адыходзіць ад тактыкі абароны ды сам ідзе ў атаку на тых, хто ў Беларусі адмаўляе сваральную ролю беларускай мовы, хто прапануе арыентавацца на сурагаты, якія нам навязваюцца суседнімі дзяржавамі. Дзеля гэтага аўтар называе імёны тых, хто ў культуртрэгерскім запале навязвае слухачам, і асабліва маладым, пагарду да роднага слова, заклікае да здрады яе жыватворным крыніцам. Парадокс у тым, што многія з іх па-майстэрску маскіруюцца ў аблічча зацікаўленасці і неабыякавасці. Канешне, аўтар не толькі палемізуе з гэтымі крытыкамі, але, дзеля справядлівасці, і адзначае іх станоўчы ўклад у развіццё айчыннай музычнай культуры, які ёсць у рэальнасці. У гэтым Вітаўт бачыць супярэчнасць іх ролі ў беларускім культурным дыскурсе. Мо таму Вітаўт прапанаваў да свайго выдання напаўжартаўлівы слоган: «Вздрогнут фсе!»

Структурна кніга «ROCK on-line» Вітаўта Мартыненкі пабудавана на эксклюзіўным матэрыяле — паводле музычна-філалагічных дыскусій у сусветным сеціве. Асаблівасць гэтых інтэрнэт-спрэчак палягае ў тым, што толькі невялікая колькасць яго ўдзельнікаў гатова раскрыць сваё сапраўднае імя. Астатнія імкнуцца схавацца пад нікамі, бо яны адчуваюць хісткасць сваёй пазіцыі і пабойваюцца негатыўнай рэакцыі беларускага грамадства на іх «аргументы» ў выглядзе бруднай лаянкі і неабгрунтаваных абразаў. Дарэчы, сапраўдныя іх імёны адкрываюцца чытачам, каб тыя ведалі сваіх «герояў». Але акрамя негатыву, дыскусія «Мартыненка vs інтэрнэт-тролі» мела і пазітыўныя старонкі. Пра гэта сведчыць філасофская частка кнігі «Інтэрв'ю з Вітаўтам Мартыненкам», у якім аўтар на падставе пытанняў чытачоў выкладвае асновы свайго светапогляду як крытыка і публіцыста.

Аўтар ідзе далей простага кампілявання матэрыялу і стварае яскравую карціну айчыннага музычна-крытычнага поля і падкрэслівае тое, як часцяком яно выкарыстоўваецца для прасоўвання розных дэструктыўных для беларушчыны ідэй і высноў. Каб найбольш яскрава «высвеціць» пазіцыі сваіх ідэйных візаві vis-a-vis, аўтар надае нямала ўвагі падмацаванню сваёй пазіцыі з дапамогай шматлікага фактычнага матэрыялу, а таксама выкарыстанню філасофскіх урыўкаў з кніг і раманаў сваіх улюбёных пісьменнікаў — К. Акулы, В. Якавенкі, К. Траўня. Дарэчы, адзін са згаданых аўтараў — пісьменнік Васіль Якавенка — адзначыў падчас прэзентацыі, што Вітаўт Мартыненка сваім новым выданнем засведчыў перамогу ў інтэлектуальным спаборніцтве, на якое яго выклікалі тыя сілы, якім беларушчына што костка ў горле.

На прэзентацыі кнігі В. Мартыненкі «ROCK on-line» прысутнічаў яшчэ адзін герой кнігі — бард і рок-музыкант Андрэй Плясанаў, які дадаў шмат фарбаў да гісторыі стварэння кнігі. Менавіта дзякуючы прыкладу Вітаўта, які доўгі час з'яўляецца адным з аўтараў тэкстаў для яго гурта P.L.A.N., Андрэй стаў на шлях актыўнай пазіцыі ў адстойванні правоў роднай мовы ў айчыннай рок-музыцы.

Не аднойчы даводзілася падкрэсліваць, што наяўнасць дыскусіі ў грамадстве сведчыць пра здаровыя тэндэнцыі ў ім. Тое ж тычыцца і дыскусій у айчынным рок-руху. Мо таму кніга В. Мартыненкі «ROCK on-line» успрымаецца як яскравае сведчанне таго, што нацыянальная плынь у беларускім рок-руху стварэецца на падставе трывалых культуралагічных і філасофскіх арыенціраў.


Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Кароль Аляксей Сцяпанавіч**

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:** 220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234. Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81. novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 372

Падпісана да друку 8.04.2011. 8.00.

Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.